Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІСТАПАД 15 1932 г. № 255 (4507) Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Тав. ГІКАЛО Ў БАБРУЙСКУ

БАБРУЙСК, 14 (Па тэлеграфу ад нашага спэцкора).

У сувязі з паглыбленьнем прарыву ў адгрузцы бульбы Ленінграду, 14 лістапада ў Бабруйск прыбыў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО. Днём тав. ГІКАЛО прысутнічаў на нарадзе савецкага актыву Рымавецкага сельсавету. На нарадзе выявілася, што з адзінаццаці членаў сельсавету бульбазагатоўкі выканаў толькі адзін, з дзесяці членаў камісіі садзейнасьці плян адгрузкі бульбы таксама выканаў толькі адзінь. Гэта сьведчыць аб слабасьці работы з боку сельсавету і РВК.

У сувязі з прыездам тав. Гікало калгасьнікі, беднякі і серадняки — аднаасобнікі абяцаюць узмацніць адгрузку бульбы Ленінграду. Арганізуюцца чырвоныя абозы.

ЗАВЯРШЫЦЬ АДГРУЗКУ

БССР вызуляецца адным з важнейшых бульбазагатоўчых раёнаў Саюзу. Наша рэспубліка займае рашаючае месца ў пляне спабжэньня бульбай пралетарскіх цэнтраў, у прыватнасьці Ленінграду.

Адгрузіць Ленінграду 191 тыс. тон — такая адказьнейшая, баявая задача ўскладзена на арганізацыі БССР. Выканаць поўнасьцю гэту задачу—справа гонару ўсёй нашай пралетарскай грамадзкасьці.

Плян адгрузкі бульбы Ленінграду зусім рэальны. Ён складае толькі 45 проц. агульнага пляну загатовак і толькі 3,4 проц. валавога ўраджаю бульбы.

Калі-б з самага пачатку кампаніі было-б забясьпечана баявое апэрацыйнае кіраўніцтва адгрузкай, калі-б мясцовыя арганізацыі адразу паставілі гэту работу ў цэнтры сваёй увагі, мы-б даўно выканалі свае абавязкі.

Аб гэтым досыць ярка гаворыць вопыт Мсьціслаўскага, Аршанскага, Веткаўскага, Лагойскага і інш. раёнаў, якія значна перавыканалі свае заданьні.

Але хоць усе тэрміны і скончыліся і наступілі замарозкі, запазычанасьць Ленінграду не ліквідавана, адгрузка ня скончана, плян выканан толькі на 82,2 проц. Тэмпы адгрузкі па-ранейшаму на вельмі ніскім узроўні.

Рад раённых арганізацый сарвалі ўсе тэрміны завяршэньня кампаніі, устаноўленыя партыяй і ўрадам. «Раз ураджай добры, а плян зменшаны, дык клапаціцца асабліва нітма чаго; з загатоўкамі і адгрузкай заўсёды паспеем». Гэтыя самацёчныя настроі, выкліканыя недаацэнкай значэньня свячасовага спабжэньня Ленінграду бульбай, прывялі да сраўных вынікаў. Загатоўчы апарат ня быў свячасова мабілізаваны, масавая работа не разгорнута, уборка ня была ўвязана з адгрузкай, на месцы не накіраваны патрэбныя сілы, у выніку бульба паступала самацёкам і плян сыстэматычна зрываўся.

Толькі калі цэнтральныя кіруючыя органы зрабілі рашучы націск, некаторыя раёны пачалі энэргічна, на-ходу выпраўляць дапушчаныя памылкі і ліквідавалі адставаньне (Магілеў, Крычаў, Брагін). Яны паказалі, што бальшавіцкая мабілізацыя ўсіх сіл забясьпечвае посьпех кампаніі.

Аднак, многія раёны дагэтуль ігнаруюць значэньне адгрузкі і тым зрываюць выкананьне абавязацельстваў, узятых на сябе БССР.

Возьмем **Лоеў**. Атрымаўшы параўнальна невялікі плян (тысячу тон бульбы, ён адгрузіў да 13 лістапада толькі 9,6%. Як назваць такую работу. Гэта вынік яўна злачынней бязьдзейнасьці, бюракратычнага спакою на адказьнейшым вучастку і апартуністычнага прымірэньцтва ў адносінах да супраціўленьня клясава-варожых элемэнтаў. А **Нараўлянскі раён**? Ня гледзячы на катэгарычныя прапановы ЦК—прыняць усе меры да стварэньня пералому—Нароўля цягнецца ў хвасьце, адгрузіўшы толькі 31,9 проц. бульбы.

Возьмем **Бабруйск**—рашаючы раён бульбазагатовак. Ён сапраўды чараналымі тэмпамі адгружае бульбу, здаўшы толькі 52,8 проц.

Такое становішча з правядзеньнем важнейшай кампаніі абсалютна нецярпіма. На адгрузцы бульбы праявяецца бальшавіцкая бальшэдушнасьць ажыцьцяўляць важнейшыя дырэктывы партыі. Аб гэтым павінны памятаць усе арганізацыі. **«Адно трэба цьвёрда памятаць—перш за ўсё, важней за ўсё, адгрузка бульбы Ленінграду; хто гэтага не разумее, той палітычны сьляпец або апартуніст» (Гікало).**

У радзе раёнаў (Працюйск, Капыль, Смалявічы) праяўляецца недаацэнка ролі аднаасобнага сэктару да загатоўкі бульбы. Там зусім забылі пра тое, што аднаасобнік па сваёй удзельнай вазе займае рашаючае месца ў адгрузцы, што загатоўкі па аднаасобных гаспадарках трэба арганізаваць, што зарука перамогі—ва ўменьні раз тарнуць масавую работу.

Калі да гэтага дадаць слабы націск на кулацка-заможныя гаспадаркі, якія сабатуюць выкананьне цьвёрдых заданьняў, дык прычыны адставаньня аднаасобнага сэктару стануць зусім яснымі.

Жартайскі сельсавет на справе паказаў, якое значэньне набывае правільная пастаноўка масавай работы. Ён першым у БССР выканаў плян збожжазагатовак. Ён-жа здолеў на аснове мабілізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, на аснове грамадзкага буксіру і сацспаборніцтва ўдарных брыгад, поўнасьцю выканаць плян адгрузкі. Яго вопыт зьяўляецца лепшым адказам апартуністам, якія хныкаюць аб немагчымасьці выкананьня пляну.

БССР павінна адгрузіць Ленінграду яшчэ 34 тыс. тон. Гэта заданьне можа быць выканана на працягу аднаго—двух дзён пры ўмове баявой работы ў кожным раёне, калгасе і вёсцы, пры ўмове адгрузкі ў дзень ня менш 1000—1200 вагонаў. Пры цяперашніх тэмпах—150—200 вагонаў у дзень — адгрузка зацягнецца на дочтія тыдні.

Выконваючы плян адгрузкі, нельга ні ў якім разе забываць пра якасьць адгружанай прадукцыі. Нельга дапусьціць, каб быў ба перамёрзла ў вагонах, каб ленінградзкія рабочыя атрымалі папсаваны прадукт. Таму **ацяпленьне вагонаў, якія накіроўваюцца на Поўнач,—баявая задача дня.**

Барацьба за бульбу—барацьба за выкананьне важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы.

Краіна патрабуе ад пралетарскай грамадзкасьці БССР неадкладнага завяршэньня адгрузкі бульбы Ленінграду.

191.000 тон бульбы Ленінграду

ЧАС НЕ ЧАКАЕ. НАСТУПІЛІ ЗАМАРАЗКІ

АДГРУЗКУ ЗАКОНЧЫЦЬ У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

АДПРАЎЛЯЦЬ БУЛЬБУ Ў АЦЕПЛЕНЫХ ВАГОНАХ

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду

(у тысячах тон на 14 лістапада).

НАЗВА ЗАГАТОЎЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ	ПЛЯН	Адгружана з пачатку кампаніі	Процант выкананьня
Белкаапплодагародніна	125	110,84	88,7
Белплодагародніна	66	46,08	69,8
РАЗАМ	191	156,93	82,2

Пераключыцца на канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва адгрузкай

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

З агульнага пляну бульбазагатовак у 5.000 тон Барысаўскі раён павінен адгрузіць Ленінграду 3.850 тон.

Заця́жка адгрузкі бульбы тлумачыцца выключна слаба разгорнутай масавай работай у вёсцы, слабай барацьбой з сабатажам кулацка-заможных гаспадарак, наяўнасьцю элемэнтаў апартуністычнай практыкі ў рабоце паасобных сельсаветаў і парт'ячэек.

Вось чаму Барысаўскі раён, які ў асноўным нядрэнна спраўляецца з правядзеньнем раду іншых гаспадарча-палітычных кампаній, застаецца ў ліку адсталых раёнаў БССР па адгрузцы бульбы Ленінграду. На 12 лістапада плян адгрузкі выканан на 72,2 проц., а выкананьне агульнага пляну бульбазагатовак па раёне складае толькі 64,1 проц.

Перадавікамі, якія з посьпехам выканалі баявое заданьне па адгрузцы, зьяўляюцца **Жартайскі і Азьдзяціцкі сельсветы.** З астатніх сельсаветаў раёну Навасельскі выканаў заданьне на 85,6 проц., Хаўхоліцкі—на 85,4 проц., Неманіцкі—84 проц., Лошніцкі—83,4 проц. і В.-Стахоўскі—82 проц.

Асабліва ганебна адстаюць **Зэмбінскі** мястачковы савет, які выканаў заданьне на 11,2 проц., Глівінскі—42 проц. і Чарневіцкі—55 проц.

Значна перашкаджаюць выкананьню пляну нездаровыя тэнэнцыі ў радзе сельсаветаў—ухіляцца ад гэтай работы, захапіцца за сыпку прысланых з раёну брыгадзіраў. Нямала ёсьць такіх членаў сельсаветаў, якія ня толькі не дапамагаюць савету, ячэйцы і ўпаўнаважаным РК, а сваімі паводзінамі падрываюць работу. Напрыклад, члены В.-Стахаўскага сельсавету **Нікітаровіч і Мароз** самі ўвесь час ухіляліся ад здачы бульбы ў парадку самаабавязацельстваў. Яны распальвалі спажывецкія тэндэнцыі і патураілі кулацкім настроям. Член прэзыдыуму гэтага сельсавету **Чура** праявіў сябе як кулацкі падпявала. На сходзе, скліканым па пытаньні адгрузкі бульбы, ён заявіў:

— Пад саўгас адрэзалі ад В.-Стахава 100 га зямлі, калгасу далі лепшую зямлю, дык там і патрабуйце выкананьня.

Чура адмовіўся зьявіцца на на-зачарговае пасяджэньне прэзыдыуму сельсавету, заявіўшы:

— Мне трэба ісьці на працу, бо за работу ў сельсавеце я нічога не атрымліваю.

За бязьдзейнасьць у бульбазагатоўках прэзыдыум сельсавету абвясьціў вымову членам с.-с. Нікіфаровічу, Марозу, Шэрсьню і інш. За дэзарганізатарскія паводзіны Чуру абвешчана вымова; ён выведзен са складу прэзыдыуму сельсавету.

Для ўзмацненьня тэмпаў адгрузкі бульбы ў дні Кастрычніцкіх сьвят пасланы ў сельсаветы рабочыя брыгады з усіх буйнейшых прадпрыемстваў Барысава. У Баранскі сельсавет выехала выязная рэдакцыя «Бальшавіка Барысаўшчыны».

Райком партыі пераключыўся на канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва адгрузкай бульбы. Сакратарыят РК КП(б)Б 13 лістапада правёў пасяджэньне ў Лошніцы па пытаньні ходу адгрузкі бульбы, 15 лістапада адбудзецца пасяджэньне ў Зэмбіне, 16—у Забашавічах і 17—у Бродаўцы. У кожным з гэтых пунктаў сакратарыят райкому заслухоўвае даклады сакратароў парт'ячэек вакольных сельсаветаў і брыгадзіраў, выпраўляючы недахопы на-ходу. Такі мэтад работы стымулюе павышэньню тэмпаў адгрузкі.

Я. Ів.

Пагрузка бульбы Ленінграду на ст. Буда-Кашалёва.

На чорнай дошцы

БАБРУЙСК. (Наш спэцкор). Бабруйскі раён увесь час ня выходзіць з чорнай дошкі па адгрузцы бульбы Ленінграду. Такое становішча абавязвае раённае кіраўніцтва мабілізаваць усе сілы на фарсаванае тэмпаў на зьнішчэньне ганебнай плямы. Аднак, гэта ня зроблена. Кастрычніцкія сьвяты ня былі скарыстаны для штурму прарываў, для ліквідацыі адставаньня. Наадварот, пасьля сьвят прарыў яшчэ больш пагыбіўся. 9 і 10 лістапада ня было адгружана ні аднаго вагона. 11 лістапада пасланы два вагоны, 12—4. Між тым штодня трэба адгружаць 25-30 вагонаў, інакш плян ня будзе выкананы.

Чым тлумачыцца такая дрэнная работа па адгрузцы бульбы Ленінграду? Прычыны заключаюцца ў аслабленьні агітацыйна-масавай работы на вёсцы, у апартуністычнай бязьдзейнасьці ладу васковых ячэек, сельсаветаў і сельспажыўтаварыстваў.

Ці накіраваны на фронт бульбазагатовак усе сілы і сродкі? Не! Возьмем такі прыклад. Вялікае значэньне набывае работа асьветнікаў на раёне. Гэты вагар барацьбы за плян не скарыстаны. Масы асьветнікаў ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў выкананьні пляну адгрузкі. Намесьнік старшыні РК працасьветы тав. **Карачун** пытаньне аб бульбазагатоўках ня ставіў на пасяджэньні райкому саюзу і ніякіх дырэктыў мясцовам і ўпаўнаважаным не даваў. Не саюзе працасьветы раўняліся іншыя прафсаюзныя арганізацыі Бабруйшчыны. Райпрафсавет абмежаваўся каёшнымі цыркулярамі і нічога канкрэтнага не зрабіў, каб уцягнуць масу членаў саюзу ў важнейшую кампанію.

Што зрабіў райком камсамолу? Ці зразумеў ён усю важнасьць свячасовага завяршэньня адгрузкі? Не! Да апошняга часу ён ня даў ні адной дырэктывы камсамольскім ячэйкам па пытаньні аб бульбазагатоўках. Да 1 лістапада ва ўсіх дырэктывах райкому, у памятках брыгадзірам гаварылася аб чым хочаш: аб збожжы, фізкультуре, ільне і толькі між іншым аб бульбе.

Толькі ў пачатку лістапада райком камсамолу накіраваў на вёску каля 100 брыгадзіраў, прыняў рашучую рэвалюцыю, у якой завастрыў увагу на палітычным значэньні адгрузкі. Камсамол абавязаўся суспроць 15-гадавіну Кастрычніка чырвонымі абозамі в бульбай. Але гэта пастанова засталася прыгожай дэкларацыяй, бо ня была падмацавана апэрацыйным кіраўніцтвам і канкротнай праверкай выкананьня дырэктыў.

Агітацыя кулацкіх элемэнтаў, накіраваная на зрыў загатовак, не сустракае належнага адпору. У в. Старына, Гарбацэвіцкага сельсавету член сельсавету **Гутюўскі** сам ня здаў ні аднаго кілё збожжа і агітаваў суспроць здачы, ня гледзячы на тое, што ў вёсцы ёсьць каля 3 тон бульбы, якія павінны быць зданы дзяржаве.

Работнікі Гарбацэвіцкага сельспажыўтаварыства ня цікавяцца загатоўкамі, заяўляючы: «Наша справа гандляваць, а не займацца адгрузкай».

Бабруйшчына павінна ва што-б там ні стала заваяваць пералом. Неабходна ўдзесяцярыць энэргію, накіраваць на гэты вучастак усе сілы і сродкі, скарыстаць усе магчымасьці. Толькі пры гэтай умове Бабруйск выканае ўскладзенае на яго баявое заданьне.

Л.К.

Як трэба заваёўваць пяршынства

ГАРАДОК. Яшчэ да Кастрычніцкіх сьвят перадавыя сельсаветы Гарадоцкага раёну, як Мехаўскі, Обальскі і Выраўлянскі першыя выканалі пляны па бульбазагатоўках.

Гэтыя сельсаветы заваявалі сваё пяршынства на аснове спалучэньня ўсіх відаў сельска-гаспадарчых работ, не адрываючы загатоўкі і адгрузкі бульбы ад загатовак збожжа, ільну і г. д. Яны сапраўды разгарнулі масавую работу сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, мабілізавалі і кінулі на вёску ўвесь партыйны, камсамольскі і сельсавецкі актыў, прымацаваўшы да кожнага калгасу, кожнага вучастку групу актывістаў на чале з брыгадзірам.

На гэту групу ўскладалася ўся адказнасьць за выкананьне пляну па бульбе і збожжы (Обальскі сельсавет).

Брыгада ня ўходзіла з калгасу або вёскі да таго часу, пакуль ня быў выкананы плян.

Паміж брыгадамі і паасобнымі актывістамі было разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва за хутчэйшае скончэньне вывазкі бульбы на чыгуначныя станцыі. Старшыя брыгадзіры прадстаўлялі кожны вечар упаўнаважанаму РК весткі аб праробленай рабоце.

Усё гэта забясьпечыла сельсаветам першае месца ў раёне па выкананьні пляну адгрузкі.

Асабліва трэба адзначыць ударную работу **Мехаўскага сельсавету,** які быў прэміраваны шасьцёркай ЦК і СНК БССР за датэрміновае выкананьне пляну.

Адстаючыя сельсаветы раёну (Вайханскі, Канчанскі, Кузьмінскі і інш.) павінны раўняцца па перадавікох.

К. П.

Шляхам грамадзкага буксіру

ЧАВУСЫ. Вёска М.-Бардзінічы, Сушчэўскага сельсавету, зьяўляецца адной з перадавых вёсак раёну ў выкананьні пляну бульбы і збожжазагатовак.

План бульбазагатовак у 1.348 пудоў быў поўнасьцю выканан 8 лістапада і ёсьць зусім нязначная запазычанасьць па збожжы (ня здана яшчэ 8 цэнтн.).

Высокую сьвядомасьць і сапраўды бальшавіцкія тэмпы паказалі члены сельсавету **Шараў Іпат** і **Хомчанка Пятро.** Яны першымі выканалі пляны і павялі за сабой усю вёску.

Шляхам грамадзкага буксіру і разгорнутай масава-растлумачальнай работы з кожным бедняком і серадняком — аднаасобнікам паасобку яны вывелі сваю вёску ў перадавыя рады здатчыкаў.

Грамадзяне гэтай вёскі **Васіленкаў Захар, Камінскі Іван, Яўтушэнка Пілип** і інш. пляны загатовак перавыкналі.

На ўрачыстым пленуме Сушчэўскага сельсавету Шараў Іпат і Хомчанка Пятро, як лепшыя ўдарнікі на фронце загатовак, былі прэміраваны.

К. С.

Прырост зусім нязначны

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Наш кар.). Бульба па адгрузачным пунктам паступае слаба. На 12 лістапада адгружана 867 тон пры заданьні ў 1.260, што складае 69,2 проц. Апошняя пяцідзеўка дала толькі 1,5 тон, у той час, калі мінулыя давалі па 7-9 і нават больш. За апошнія два дні зусім ня было прыросту.

Недапушчальнае адставаньне можна тлумачыць толькі адсутнасьцю апэрацыйнага кіраўніцтва адгрузкай з боку райсаюзу і значнай часткі парт'ячэек і сельсаветаў раёну.

Загадчык райсаюзу тав. **Цімкоўскі** кіруе адгрузкай толькі праз тэлефонныя загады: «пазваніў у сельсавет, накруціў хвост, няхай выконваюць». Ніякай дапамогі мясцом райсаюз не аказвае.

Прусаўскі, Запольскі і Крайскі сельсветы выканалі плян адгрузкі менш чым на палову. Практыка работы **Зарэцкага** сельсавету, які дабіўся выкананьня пляну адгрузкі на 100,5 проц., паказвае поўную магчымасьць свячасовага завяршэньня кампаніі. Гэты сельсавет дабіўся посьпеху дзякуючы добрай рабоце буксірных брыгад з перадавікоў.

У парадку сустрэчнага

БАБРУЙСК. (БелТА). Калгас імя Карла Маркса звыш пляну здаў дзяржаве 5 тон бульбы, выканаўшы такім чынам заданьне на 107 проц. Калгас «Перамога» ў дні Кастрычніцкіх сьвят дадатково здаў дзьве тоны для чырвонага эшалёну Ленінграду.

Гэтым калгасы выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва суседнія калгасы і арганізавалі сацыялістычную дапамогу на хутчэйшым скончэньні адгрузкі.

Бэрлін—Жэнэва

Цяперашняя абстаноўка—абстаноўка канца адносная стабілізацыі капіталізму і пераходу да новага туру войнаў і рэвалюцый. У абстаноўцы паглыбленьня крызісу, пачварнага зьбяднення мас, лютага тэрору буржуазіі, абвастрэньня клясавых супярэчнасьцей, нарастаньня рэвалюцыйнай хвалі вельмі характэрны раптоўныя і вострыя выбухі абурэньня мас супроць капіталістычнай эксплёатацыі, буржуазнай дзяржавы, капіталістычнага тэрору і разбою і нарастаньне рэвалюцыйнай хвалі ва ўсіх краінах, нарастаньне рэвалюцыйнага крызісу ў радзе капіталістычных краін.

Капіталістычная Эўропа грунтоўна насычана рэвалюцыйным порахам. Ня гледзячы на жорсткі тэрор, сацыял-фашысцкае апушканьне мас, наперакор іллжы і паклёпу нязьлічонай колькасьці буржуазных газэт, часопісяў, кніг—расьце рэвалюцыйнае абурэньне мас. Зараз літаральна кожны дзень прыносіць новыя і новыя падзеі, якія бліскуча пацьвярджаюць тэзісы XII пленуму Выканкому Камінтэрну аб канцы адноснай стабілізацыі.

Возьмем падзеі апошніх дзён, адзначаныя радам вострых сутычак клясаў у розных краінах. Забастоўка 160.000 лянкаширскіх прадзільшчыкаў, галодны паход беспрацоўных на Лёндан, які суправаджаўся дэманстрацыямі і бурнымі сутычкамі рабочых з паліцыяй такіх разьмераў, якіх ня ведала старая «мірная» Англія ад часу чартыцкага руху. На другім канцы капіталістычнай Эўропы—у Германіі выбухнула сьледам за гэтым усеагульная забастоўка рабочых бэрлінскага гарадзкога транспарту. Забастоўка, якая пачалася напярэдадні выбараў у райхстаг і адбывалася ўвесь дзень выбараў, была бліскучым прыкладам стварэньня адзінага фронту зьнізу, наперакор волі сацыял-фашыстаў—вернай агентуры буржуазіі.

Орган біржавікоў «Бэрлінэр Бэрзэн цэйтунг» пісаў адносна забастоўкі: «Над Бэрлінам павісьлі лістападаўскія настроі. Упераадзе напружанасьць, непакой аб тым, што на се нам лістапад. Новы нечаканы фактар—забастоўка гарадзкіх транспартнікаў вырвалася віхрам. Забастоўка мае палітычны характар».

Трывога органу біржавых спэкулянтаў не дарэмная. 6 лістапада прынесла перамогу германскай кампартыі на выбарах. Упераадзе—месяцы суровай барацьбы.

Забастоўка бэрлінскіх транспартнікаў—новы этап у гэтай барацьбе. Аб'яднаньні намаганьнямі рэфармісцкіх прафбюракратаў, нацыянал-сацыялістаў і ўсяго апарату ўвалту фашысцкай дзяржавы, расстрэламі забастоўшчыкаў, арыштам 1.500 бастуючых, прымусовай арбітражнай пастановай забастоўка была зломана. Але скончэньне забастоўкі **не азначае паражэньня бэрлінскіх транспартнікаў.**

Рабочыя арганізавана вярнуліся на работу паводле пастановы забастовачнага камітэту. Калі буржуазіі ўдалося правесьці зьніжэньне зарплаты транспартнікам Бэрліну пры напружаньні ўсіх сваіх сіл і разьюшаным тэрорыі,—пасьля ім не ўдалося зламаць баявы дух забастоўшчыкаў. Усе даныя аб скончэньні забастоўкі гавораць за тое, што ня глядзечы на звальненьне 2.500 рэвалюцыйных рабочых, **бэрлінскія транспартнікі поўны цьвёрдай рашучасьці весьці далей барацьбу.**

Забастоўка прагучэла як прызыўны звон да ўсяго германскага пралетарыяту разгарнуць барацьбу супроць капіталу, яго сацыял-фашысцкай агентуры. 8 лістапада скончылася забастоўка бэрлінскіх транспартнікаў. 10 лістапада прагрымелі стрэлы ў рэзыдэнцыі Лігі імпэрыялістычных разбойнікаў—у Жэнэве. 17 забітых і 65 цяжка параненых—такі вынік дэманстрацыі жэнэўскіх рабочых, якія пратэставалі супроць вайны і фашызму.

«Ціхая» Швэйцарыя стала арэнай жорсткіх клясавых баёў. Жэнэва, дзе адбываюцца бясконцыя пасяджэньні разбраенчай кантэрэнцыі, што маюць на мэце прыхаваць падрыхтоўку новай імпэрыялістычнай вайны і антысавецкай інтэрвэнцыі, стала арэнай форменных баёў іменна на глебе сапраўднай барацьбы рабочых мас супроць небясьпекі імпэрыялістычнай вайны, якая падрыхтоўваецца ня толькі ў гэшптабах капіталістычных дзяржаў, але і ў ціхіх залях пасяджэньняў разбраенчай канфэрэнцыі разбойніцкай Лігі нацый.

Швэйцарскі ўрад, які дзейнічае па ўказцы «Лігі нацый» і які расстраляў антываенную дэманстрацыю, паказаў перад усім сьвет там сапраўдную цану запэўненьняў імпэрыялістаў, засядаючых у Жэнэве, што яны за мір, што яны хочуць разззбройвацца.

Як-жа разгортваліся падзеі? 10 лістапада 6.000 рабочых Жэнэвы выйшлі на вуліцу, каб пратэставаць супроць правакацыі фашысцкай арганізацыі «саюзу нацыянальнага аб'яднаньня», саюзу, які склікаў мітынг, дзе фашысты супольна з кіраўніком кантанальнага ўраду «выступілі» супроць удзельнікаў Амстэрдамскага антываеннага кангрэсу. **Войскі і паліцыя сустрэлі рабочых агнём кулямётаў.** Перад самым расстрэлам адбывалася братаньне паасобных салдат з дэманстраваўшымі рабочымі.

У адказ на гэтыя расстрэлы прыйшоў у рух увесь швэйцарскі пралетарыят. Масавыя сходы і дэманстрацыі выносіліся пратэсты супроць бойні, наладжанай над рабочымі ў Жэнэве. 11 лістапада кампартыя высунула лёзунг генэральнай забастоўкі, да якога наперакор рэфармісцкім лідэрам далучылася прафсаюзная дэлегацкая канфэрэнцыя.

12 лістапада ў Жэнэве адбыліся бурныя выступленьні рабочых наперакор забароне ўраду, наперакор увядзеньню стану аблогі і ваенна-палявых судоў.

Баставаў амаль увесь жэнэўскі пралетарыят. 10 тыс. рабочых хавалі таварышоў, расстраляных паліцыяй. Частка дэманстрацыі падыйшла да казармаў, дзе была залёрта вайсковая часьць. Салдаты, разьбіўшы вокны ў казарме, браталіся з рабочымі.

Падзеі ў Жэнэве маюць вялізарнае значэньне для сапраўднай мабілізацыі мас на барацьбу супроць вайны. Недарма «Бэйлінэр» пісала аб жэнэўскіх падзеях: «ніхто не чакаў, што іменна тут, у гэтай краіне, падыме сваю галаву падобны мяцеж. Трэба адзначыць, што сутычкі ў Жэнэве выдзяляюцца з усіх падзей апошніх год сваёй шырынёй і сваімі сур'ёзнымі вынікамі».

Буржуазія занепакоена падзеямі, якія разгарнуліся ў маленькай Швэйцарыі. Іх значэньне выходзіць далёка па-за межы гэтай краіны. Яны сьведчаць аб тым, што рабочыя масы краіны капіталу ня хочуць больш быць гарматным мясам імпэрыялістаў. Швэйцарскія салдаты ня хочуць вайны, ня хочуць змагацца супроць рабочых. Мабілізаваныя салдаты, у тым ліку адзін жэнэўскі батальён, у знак пратэсту супроць расстрэлу рабочых разграмілі прылеглы да казармы выставачны палац. 7 і 13 батальёны жэнэўскіх войск атрымалі загад выступіць у Цурых, але адмовіліся падпарадкавацца загаду і атрымаць баявое снаражэньне.

Рух прыняў такі шырокі характар, што ўрад быў прымушан распусьціць дамоў частку жэнэўскіх войск. Салдаты 13 батальёну маршыравалі па горадзе зусім у беспарадку, праразаючы паветра варожымі воклічамі па адрасу афіцэраў, а потым накіраваліся да турмы Сант-Антуан, дзе пачалі братацца з рабочымі. Ваенны апарат буржуазнага панаваньня—армія перастала падначальвацца.

Але гэта ня толькі ў Швэйцарыі. Барацьба супроць вайны і антысавецкай інтэрвэнцыі пераходзіць на новую ступень. Жэнэва—перасьцярога сусьветным разбойнікам і заклік да рэвалюцыйнай барацьбы супроць вайны і буржуазнага панаваньня ва ўсіх краінах капіталу. 40-тысячная дэманстрацыя парыскіх рабочых супроць вайны (11 лістапада)—лішні доказ таго, што пралетары Францыі ідуць рука ў руку са сваімі швэйцарскімі братамі па клясе.

Капіталістычная Эўропа бурліць. Нароўнамерна разьвіваюцца рэвалюцыйныя працэсы ў краінах капіталу. Але яны разьвіваюцца нерана.

(Перадавая «Праўды», перададзная па радыё).

АБ ПАСЫЛЦЫ У РАЕНЫ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ ГРУПЫ ЦЭНТРАЛЬНЫХ РАБОТНІКАЎ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 13 лістапада

КАМАНДЫРАВАЦЬ У РАЕНЫ НА ТРЫ ДНІ НАСТУПНЫХ ТАВАРЫШОЎ:

1) АСІПОВІЧЫ—БАСКІНА; 2) БАБРУЙСК—ГІКАЛО; 3) БАРЫСАЎ І КРУПКІ—ЖАБРОЎСКАГА; 4)-Б.-КАШАЛЁВА—ЖОЛУДАВА; 5) БЯЛЫНІЧЫ — ШАРАНГОВІЧА; 6) ДУБРОЎНА—КУДЗЕЛЬКА; 7) КІЧАЎ—СТРАКОЎСКАГА; 8) ЛЕПЕЛЬ—ГРЫСЕВІЧА; 9) ЛЮБАНЬ—ЦЭНЦЫПЭРА; 10) МАЗЫР—РЭВІНСКАГА; 11) НАРОЎЛЯ—Н. ГУРЗВІЧА; 12) ПАРЫЧЫ—ГЕРЦОВІЧА; 13) РАГАЧОЎ—МАСЮКОВА; 14) СМАЛЯВІЧЫ—ШЛЯКТАРАВА; 15) ЦЕРАХАЎКА—КАРТУКОВА; 16) ЧАВУСЫ—ІВАНОВА; 17) ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА—ЖУКОВІЧА; 18) ШКЛОЎ—ШАРАВА.

Аб апартуністычнай недаацэнцы бульбазагатовак і адгрузкі пятрыкоўскай раённай газэтай

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

Адзначыць, што газэта «Калгасьнік Пятрыкоўшчыны» апартуністычна недаацаніла значэньне выкананьня пляну бульбазагатовак і адгрузкі, не мабілізавала шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў на гэту важнейшую гаспадарча-палітычную задачу, за што нам, рэдактару газэты т. Ткачову абвясьціць суровую вымову і зьняць з работы.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Партыйнае будаўніцтва

Партыйны дзень—магутны вагар бальшавіцкага выхаваньня камуністаў

Дрэнна арганізавалі сход

Сход партыйнага калектыву заводу імя Домбаля дастасаваны быў да выходнага дня. На парадку дня:

1. Вынікі верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

2. Аб выкананьні прамфінпляну за трэці квартал і задачах на чацьверты квартал.

Гэты парадак вызначае сабой як аб'ём, так і важнасьць работы сходу і неабходнасьць ня толькі поўнай яўкі камуністаў, але і шырокага ўцягненьня беспартыйных рабочых.

На справе-ж аказалася іншае. У вызначаны час пачатку сходу — 4 гадзіны дня — пачалі зьяўляцца толькі адзінкі. У чырвоным кутку, з пабітымі шыбамі ў вокнах, дзе надакучліва пасьвіствае вецер, дзе няма ні газэт, ні шахматаў, дзе няма нічога, апрача лёзунгаў на сьценках, вельмі нудна праходзіць час. Яшчэ павальней зьбіраюцца людзі на сход.

Праз гадзіну ў залі чалавек 30.

Прайшла яшчэ гадзіна. Сакратар партакалектыву тав. Кавальчук абвясьціў сход адкрытым. Да гэтага часу зьявілася 47 камуністаў (менш 50 проц. складу партакалектыву) і чалавек 20 беспартыйных рабочых.

Слова для дакладу па першым пытаньні прадастаўляецца культпропу РК КП(б)Б тав. **Паяркову.** Дакладчык даволі поўна ахарактарызаваў асноўныя моманты пастаноў пленуму аб разгортваньні савецкага гандлю, вырабе прадметаў шырокага спажываньня і разьвіцьці чорнай мэталюргіі.

У выстарчальнай меры завострана ўвага партакалектыву на практычных задачах, якія вынікаюць з пастаноў пленуму.

За Паярковым з дакладам аб выкананьні прамфінпляну выступіў дырэктар заводу тав. **Шульгін.**

— Вынікі работы па выкананьні прамфінпляну за трэці квартал ня зусім здавальняючыя. Заданьне па вырабу на мясцовы рынак выканана на 99 проц. у цэнасным вызначэньні. Заданьне па вырабу на экспарт выканана толькі на 84 проц. Надзвычай дрэнна стаіць справа з якаснымі паказальнікамі. Брак павялічыўся.

Значна аслабла працоўная дысцыпліна. Прагулы за жнівень складалі 6,4 проц., за верасень — 4,8 проц. Аслабла масавая работа ў нізавых зьвеньнях вытворчасьці.

Даклад скончан.

Якія будуць пытаньні?

Маўчаньне.

Хто хоча выказацца?

Кожны з прысутных азадачан. Пытаньняў шмат, з чаго пачынаць, на чым галоўным чынам канцэнтраваць сваю ўвагу. Вось гэтым і тлумачыцца вялікая паўза паміж дакладам і пачаткам спрэчак.

Пасьля «раскачкі» ў спрэчках усё-ж выказалася 12 таварышоў.

Адзначаючы вялізарнейшае значэньне пастаноў пленуму ЦК, большасьць прамоўцаў канцэнтравала ўвагу на недахопах работы ЗРК, па задачах разгортваньня самазагатовак і шапырэньня ўласнай харчовай базы. Мелі месца і няправільныя выступленьні асобных таварышоў, якія імкнуліся тлумачыць недавыкананьне прамфінпляну выключна дрэннай работай сталоўні і ЗРК.

Арганізацыя працы па-новаму, мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, работа нізавых партсьвеньняў — цэх'ячэек і партгруп, агітацыйна-масавая работа партыйнага калектыву амаль нікім з выступаючых не закраналіся.

На недахопах партыйнай арганізацыі спыніўся ў сваім выступленьні толькі сакратар партакалектыву тав. Кавальчук. Прычым крытыка гэтых недахопаў насіла павярхоўны неканкрэтны характар. Кавальчук не знаёмы патрэбным на канкрэтных фактах работы асобных партыйных груп і асобных камуністаў паказаць, як трэба і як ня трэба змагацца за прамфінплян. Ён таксама зусім абыйшоў пытаньне партыйна-масавай работы, пытаньне бальшавіцкай агітацыі.

Які вывод? Бясспрэчна, што гэты сход партакалектыву зьявіўся важным фактарам, які мабілізуе камуністаў на практычнае ажыцьцяўленьне задач, вызначаных пленумам ЦК УсеКП(б) і задач выкананьня прамфінпляну.

Аднак, куды больш даў-бы сход, калі-б абмяркоўвалася толькі адно з гэтых двух пытаньняў. Або, калі-б пытаньні прамфінпляну разглядаліся з пункту гледжаньня работы партарганізацыі, яе ячэек і груп.

Шульгін пабудаваў свой даклад, як звычайную справаздачу перад аб'яднаньнем Шклофарфару, не сканцэнтраваў увагі на важнейшых пытаньнях, на партыйнай рабоце і ў гэтым істотны недахоп дакладу. Гэта між іншым зьяўляецца таксама адной з прычын слабай актыўнасьці камуністаў.

Буйнейшым недахопам, у рэзультаце якога была нізкая актыўнасьць і слабы ўдзел беспартыйных, зьяўляецца **слабасьць падрыхтоўчай работы** да сходу. Зацяжка сходу на 5 гадзін, ня лічачы патрачаных дзьвюх гадзін на збор, таксама надзвычай дрэнна адбілася на актыўнасьці і таму, між іншым, прыняцьце пастановы прайшло без дэтальнага шырокага абгаварэньня пунктаў канкрэтных задач работы.

Такім чынам ня зусім умелая арганізацыя самаго сходу, і асабліва дрэнная яго падрыхтоўка значна панізілі той эфэкт, які павінен быў атрымацца ў рэзультаце абмеркаваньня такіх важных палітычных пытаньняў.

На ліквідацыю гэтых недахопаў павінна быць накіравана ўвага партыйнага кіраўніцтва заводу імя Домбаля пры арганізацыі наступных партыйных дзён і сходаў пэхавых ячэек.

Я.

Дзень кандыдата на шаўковай фабрыцы

Партакалектыў шаўковай фабрыкі (Магілеў) зусім малады. Ён рос і гартаваўся побач з хуткімі тэмпамі будаўніцтва самой фабрыкі і пасьляховым асваеньнем тэхнічных працэсаў вырабу штучнага валакна.

Калі на 1 лістапада 1930 г. (час пачатку работы самой фабрыкі) партакалектыў налічваў у сваіх радах 155 чалавек, дык на 1 лістапада 1932 г. мае 429 чал.

Дырэктывы партыі аб перабудове партыйна-масавай работы на вытворчасьці знайшлі сваё праламленьне ў партакалектыве фабрыкі.

На фабрыцы арганізаваны моцныя, балькольныя цэхавыя ячэйкі, вылучаны групавыя партарганізатары і групагітатары. Атрымліваючы канкрэтнае жывое кіраўніцтва, яны сталі сапраўднымі арганізатарамі рабочых мас.

Чытаньне ў брыгадах, у групах газэт, ясныя і выдарчальныя адказы на запытаньні рабочых, разгортваньне сацыялістычных мэтадаў працы, давядзеньне да кожнага рабочага дырэктыў партыі і ўраду зьяўляюцца асноўнай работай парторга і групагітатараў.

Цэх'ячэйкі ператварыліся ў сапраўдныя апорныя пункты парткіраўніцтва ўсёй барацьбой за прамфінплян, за асваеньне тэхнічных працэсаў вытворчасьці.

Дзякуючы шырока разгорнутай партыйна-масавай рабоце партарганізацыя па-бальшавіцку мабілізавала ўвесь рабочы калектыў фабрыкі на пасьляховае выкананьне пастаўленых перад фабрыкай задач.

Згодна праекту фабрыка павінна даць 4.000 клгр. шоўку ў суткі. Гэта праграма рэалізавана на два месяцы раней вызначанага тэрміну. Зараз выпрацоўваецца 4.500—5.000 клгр. у суткі.

Партакалектыў фабрыкі здолеў у апошнія месяцы дабіцца належнага зруху ў пастаноўцы палітвыхаваньня кандыдатаў партыі і беспартыйных рабочых.

Узорам палітвыхаваньня маладога папаўненьня можа служыць праведзеная работа да дня кандыдата партыі.

Падрыхтоўка да сходу кандыдатаў цэх'ячэйкамі распачалася за тыдзень раней. Кожная парт'ячэйка прапрацавала гэта пытаньне на бюро і на агульных партсходах. Праведзеен інструктаж парторгаў і групагітатараў, якім даны зусім выразныя і канкрэтныя заданьні па падрыхтоўцы дня кандыдата.

Вялікую падрыхтоўчую работу правялі насьцешгазэты цэхаў. Кожнаму кандыдату партыі і лепшым ударнікам былі ўручаны запрашальныя лісты.

Добрая падрыхтоўка забясьпечыла 100 проц. яўку ўсяго кандыдацкага складу і шырокі ўдзел беспартыйнага актыву.

У выніку такой дасканалай падрыхтоўкі сход прайшоў з вялікай актыўнасьцю. Звыш 50 заяў на гэтым сходзе падана аб прыёме ў партыю.

Вопыт палітвыхаваўчай масавай работы з кандыдатамі і беспартыйным актывам шаўковай фабрыкі павінен стаць прыкладам для ўсіх партарганізацый.

Задача бальшавіцкай шаўковай фабрыкі за ключаецца ў тым, каб замацаваць дасягнутыя посьпехі ў перабудове партыйна-масавай работы, і палітвыхаваўчую работу з кандыдатамі партыі замацаваць сыстэматычнай партвучобай.

Ражанец.

ПРАЕКТ БУДЫНКУ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК



Капрыз, ці зьдзекі?

Юрка Новік — кваліфікаваны аграном — вось ужо на працягу двух месяцаў без работы. Не раз гаварылася, ў важнейшых пастановах партыі аб тым, што пытаньне кадраў актуальнейшае пытаньне дня. Асабліва востра гэта адчуваецца ў сацсэктары сельскай гаспадаркі. Нямала ёсьць вучасткаў, дзе да зарэзу патрэбны аграномы, аднак, іх няма.

Дык чаму-ж Новік беспрацоўны?

Тут адразу не адкажаш. Патрэбна разабрацца ў фактах, якія абумовілі гэта здарэньне.

Новік быў загадчыкам аднаго з вучасткаў **Аршанскай МТС.** Пры рэарганізацыі сыстэмы абслугоўваньня калгасаў гэты вучастак быў ліквідован. Але-ж гэта ня значыць, што для Новіка не знайшлося работы. Аграном едзе і працуе ў калгасах Ярошкаўскага сельсавету. А праз 10 дзён прыняў першы вучастак.

Раптам, як гром у ясны дзень—«маланка» з Белтрактарацэнтру:

«Аграному Новіку зьявіцца ў распараджэньне Белтрактарацэнтру». Тав. Новік падпарадкуецца гэтаму распараджэньню. Едзе ў Менск.

— Прыехаў? Добра. Ну дык вось, заразка выязджай у адзін з прымежных раёнаў.

— Чаму?

— Таму, што цябе, як халасьцяка, лягчэй перакінуць.

Гэта для Новіка было нечакана. Як гэта ён халасьцяк? Ён дакумантамі даказаў, што ён мае жонку і дзіця. І вось пакуль Новік быў у Белтрактарацэнтры. Аршанская МТС зволіла яго з работы.

Два тыдні патрабавалася для заканчэньня цеганіны па справе Новіка, два тыдні не дапускалі яго да работы.

У сярэдзіне мая Новік зноў працуе на вучастку Аршанскай МТС.

Але на гэтым справа ня спыняецца. Да Новіка пачынаюць чапляцца. Аднойчы кіраўніцтвам МТС быў перакінут трактар з другога вучастку на вучастак Новіка. Ці трактарысту надакучыла ехаць, ці моска не хацелася там працаваць — гэта невядома. Толькі ён недаехаўшы да месца прызначэньня завярнуўся назад у Воршу і ў апраўданьне свайго ўчынку ўдаў Новіка: быццамбы ён (Новік) не стварыў належных умоў для працы. Дыракцыя абурана. У гневе яна аддае загад:

— Зволіць аграпома Новіка з работы ў МТС.

Даведаўшыся аб гэтым загадзе, Новік ідзе да дырэктара з тлумачэньнем. Справа абарачаецца другім бокам — Новік ня вінават. Дырэктару соромна за сваю пасьпешнасьць, але і соромна прызнаваць віну. Невінаватаму Новіку вызначаецца новае пакараньне:

— Суровая вымова з папярэджаньнем.

Зьнявожаны аграном і пасьля гэтага працягвае працаваць.

Але, як кажуць — «па Макара ўсе шышкі валяцца». Аднаго разу давялося упаўнаважанаму Белтрактарацэнтру Тамашэўскаму з дырэктарам Аршанскай МТС праяжджаць па вучастку. Заехалі і да Новіка. Якраз у гэты момант і здарылася «бяда»: трактарысты найшлі абедаць і трактары сталі без работы.

— Што, трактары стаяць без работы? Дзе загадчык вучастку? Гнаць такіх з работы, безадказна гнаць, — даў указаньне Тамашэўскі дырэктару МТС.

— Добра, добра, будзе зроблена, — запэўніў дырэктар упаўнаважанага.

І гэта было зроблена.

І вось на працягу больш як 2-х месяцаў Новік без працы. Ходзіць ад установы да ўстановы з хадайніцтвам, са скаргамі аб няправільным звальненьні. Яму і да сёньняшняга дня не ўдалося дабіцца задаваленьня яго законнай просьбы. Усюды, дзе ён толькі быў, ён атрымліваў стандартны адказ:

— Добра, патлядзім.

Новік прайшоў такі шлях: РКК Аршанскай МТС, Белтрактарацэнтр, Аршанская РКК-РСІ, пракуратура рэспублікі. Усе яны спачуваді Новіку, абяцалі дапамагчы. Але пакуль-што праходзіць ужо трэці месяц, а вынікаў няма.

Калі-ж яны будуць?

Ч — н.

„На што-ж скарыстаны 50.000 руб.?"

(Ліст загадчыка клюбу)

Нова-Беліцкая фабрыка «Везувій» ўжо трэці год ня сходзіць з чорнай дошкі. Адной з прычын зьяўляецца тое, што як адміністрацыя, так і бюро партакалектыву і заўком недаацэньваюць культурна - масавай работы.

Пры фабрыцы ёсьць рабочы клюб, які пры належнай увазе да яго мог-бы цалкам абслужыць рабочы калектыў фабрыкі палітыка-выхаваўчай і культмасавай работай. Аднак, гэтай увагі няма. Становішча клюбу такое, што няма ніякай магчымасьці арганізаваць якой-бы там ні было работы ў ім.

Клюб пабудован яшчэ ў 1923 годзе. Пачынаючы з таго часу, ён ні аднаго разу не рамантаваўся. Дах працякае, абвальваецца штукатурка, прагнілі вокны, падлога і дзьверы. У клюбе няма ніякага абсталяваньня.

Асноўнай прычынай такога становішча клюбу зьяўляецца ўпартае нежаданьне адміністрацыі фабрыкі выконваць адзін з пунктаў калдагавору аб тым, што заводакіраўніцтва абавязана ўтрымліваць за свой кошт ахову, асьвятленьне, апаленьне клюбу і абсталёўваць яго, а таксама і тое, што прафсаюзная арганізацыя ня турбуецца аб тым, каб заводакіраўніцтва адказала за парушэньне калектыўнага дагавору.

На працягу трох год клюб быў без аховы і ўборкі. За апошнія два гады заводакіраўніцтва не адпусьціла для клюбу ні аднаго кубамэтру дроў. З гэтай прычыны ў асеньня-зімовы час у клюбе нельга праводзіць ніякіх заняткаў. Адсутнасьць аховы клюбу прывяла да таго, што ў ім распрадзена значная частка клюбнай маемасьці.

6 кастрычніка б. г. пытаньне аб палным клюбе разглядалася прэзыдыумам Гомельскай райКК РСІ. Там была прынята пастанова аб тым, каб рамонт клюбу быў скончан не пазьней 15 кастрычніка. На жаль, КК-РСІ не паклапацілася аб тым, як выконваецца гэта пастанова. Клюб да гэтага часу не адрамантован.

Рабочыя і работніцы фабрыкі ўжо ня раз зварачаліся да мяне з запытаньнем, калі ўрэшце пачнуць працаваць тыя ці іншыя гурткі, калі адкрыецца чытальня і пакой палітдапачынку? Што адказаць на гэта запытаньне — я ня ведаю. Ведома толькі тое, што спасыланьні дырэктара фабрыкі тав. **Цэйтліна** на недахват сродкаў нічым неабгрунтаваны, што кожны год заводакіраўніцтва сьпісвае на амортызацыю клюбу значную суму грошай, якіх павінна быць ня менш 50 тыс. руб.

Цікава — на што скарыстоўваюцца гэтыя сродкі?

ПАЛУНОЎСКІ.

Герої шаблённых рэзалюцый

(Ліст з Веткі)

Па **Веткаўскім** раёне рэагаваньне на лісты рабочых і калгасьнікаў і на допісы, зьмешчаныя ў цэнтральным і раённым друку, пастаўлена дрэнна. У радзе выпадкаў «рэагаваньне» абмяжоўваецца пакладваньнем на лісты шаблённай рэзалюцыі. Ні адна арганізацыя і ўстанова ў раёне ня мае адказных людзей, якія-б сачылі за тым, каб сыгналы рабселькораў не заглохлі.

У Веткаўскім **райкалгассаюзе** валяцца на сталох без усялякага ўліку і рэагаваньня больш сотні лістоў і допісаў. Калі-ж да гэтага дадаць тую колькасьць лістоў, якія работнікамі райкалгассаюзу згублены, можна будзе ўявіць характар адносін гэтых работнікаў да рабселькораўскіх сыгналаў.

Яшчэ ў **чэрвені** рэдакцыя раённай газэты паслала ў райкалгассаюз для расьсьледваньня ліст калгасьніка, у якім паведамлялася аб тым, што ў калгасе «Іскра» разбазарваецца намольны збор, раскрадваецца грэчка і г. д. Гэты ліст праляжаў у райкалгассаюзе **да 22 верасьня** і быў зьвернут у рэдакцыю з бюракратычнай пазнакай: «факты паказаныя ў заметцы, цалкам пацьвердзіліся». Прычыць жа крокі да ліквідацыі гэтых фактаў райкалгассаюз не палічыў патрэбным.

Ня лепш лёс чакае лісты, якія памацаюць у Веткаўскі **райвыканком.** Там рабселькораўскія допісы пралежваюць па цэлым годзе.

На працягу апошняга часу ў раённай газэце было апублікавана шмат рабселькораўскіх допісаў і лістоў рабочых і калгасьнікаў, якія заслугоўваюць вялікай увагі. Між тым, ні адна раённая ўстанова не паклапацілася аб тым, каб падхапіць сыгналы друку, забясьпечыць іх дзейнасьць.

Райпракурор тав. **Зубчонак** нават на тапія лісты, якія ўскрываюць парушэньне рэвалюцыйнай законнасьці ня лічыць патрэбным рэагаваць. У яго некалькі месяцаў праляжаў допіс «За крадзёж калгаснага хлеба да адказнасьці». Калі-ж зьвярнуліся да яго за вынікамі, ён адаслаў да сьледчага, прычым у апошняга гэтага допісу не аказалася...

А вось прыклад таго, як рэагуе на селькораўскія допісы Веткаўская **райКК РСІ.** Разглядаючы допіс калгасьніка аб тым, што член праўленьня райспажыўсаюзу Шановіч, зяжджаючы ў калгас «Новае жыцьцё», пінстве, забірае з калгасу для сваіх патраб кармы,—райКК РСІ вынесла наступную пастанову: «Допіс поўнасьцю **не** пацьвердзіўся. Паказаць тав. Шановічу, што яго частыя заезды ў калгас на качоўку(?) і карміленьне коняй выклікаюць сярод калгасьнікаў нездаваленьне»... 25 мая рэдакцыя дасылала Веткаўскай райКК РСІ допіс рабкора, у якім выкрываўся рад злачынстваў Веткаўскага лесгамгасу. РайКК РСІ паведаміла рэдакцыю газэты аб тым, што «факты пацьвердзіліся» толькі тады, калі аўтар допісу дзельцамі з лесгамгасу быў зьнят з працы.

Так «рэагуюць» у Веткаўскім раёне.

Нскпарэль.

Тайланышэн

Савецкі Кітай

XV-я гадавіна Кастрычніка сустала з пяцігодзьдзем існаваньня галоўнейшых савецкіх раёнаў Кітаю.

Ніць год працоўныя масы Кітаю на чале з пралетарыятам, стварыўшым другую ў сьвеце дзяржаву Саветаў — рэвалюцыйна-дэмакратычную дыктатуру рабочых і сялян, — вядуць бязупынную, крывавую барацьбу не на жыцьцё, а на сьмерць з буржуазна-памешчыцкай гаміндананаўскай рэакцыяй і сусьветным імпэрыялізмам.

Пасьляховы рост савецкага руху ў Кітаі і хуткае нерастанае аграрнай рэвалюцыі ў сацыялістычную магчыма іменна таму, што існуе СССР — магутная сацыялістычная бацькаўшчына пралетарыяту і прыгнечаных працоўных мас усяго сьвету.

У другой Савецкай краіне сьвету зараз адбываецца вялікая ломка і расчыстка кітайскай вёскі ад фэадальна-прыгонніцкіх адносін. Барацьба, пачатая пяць год таму назад на вуліцах Кантону і ў вёсках Хайлуфана, ахапіла восем найбольш населеных правінцый Паўднёвага і Цэнтральнага Кітаю: **Ань-Хой, Хэнань, Хубэй, Цзянсі, Фуцзян, Хунань, Чжэнцзян і Сычуань, дзе ў 167 паветах** з 98 мільёнамі сялян устаноўлена моцная савецкая ўлада з усенародна выбранымі саветамі рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў і дзе назаўсёды зьнішчан учэбк буржуазна-памешчыцкага гаміндангу. Нават непрымірымыя ворагі савецкага ладу вынушаны прызнаць посьпехі савецкага руху ў Кітаі і прызнаць яго прагрэсыўны характар у параўнаньні з зашчэлачным гаміндангам. «Пекін Цзяньцзін таймс», газэта, якая стаіць на варце імпэрыялізму, так ацэньвае посьпехі саветаў:

> «Камуністы арганізоўваюць кожную зноў занятую вёску і павет і ўзводзяць моцную пабудову, пачынаючы з самага фундаманту. Падзеі аднаўляюць у мінлітуры тое, што здывалася ў СССР, г. зн. задушэньне буржуазіі, а потым правядзеньне сьвядомых рэформ. Яны выкарэнілі гандаль опіумам, зрабілі перараз-мерканьне буйных зямельных вучастка ў, зраўнялі і ўпарадачылі падатковае абкладаньне, пабудавалі школы... «Зьнішчы ны кабальныя піхалоскія зьдзелкі і абавязацельствы. Анулываны ўсе даўгі і арэнды плацяжы. Памешчыцкі с.-г. інвэнтар падзяляецца сярод вясковай беднаты і батрацтва, якое надзелена зямлёй. Чырвонымі прыняты ўсе меры да прыцягненьня на свой бок мас і няма сумненьня ў тым, што шырокія сялянскія копы і рабочыя на іх баку».

Такова цьвярозая ацэнка ворага, які стаіць перад тварам кітайскай рэвалюцыі. На гэты раз баяцца пахвал чыма чаго.

Праводзячы аграрную рэвалюцыю ў інтарэсах бяднейшага і сярэднятцкага сялянства, выкваляючы яго ад кабалы памешчыка і ліхвяра, уцягваючы сялян у будаўніцтва сваёй рабоча-сялянскай улады — **кітайскія саветы сваім прыкладам рэвалюцыянізуюць белы Кітай і расхіствацюць гаміндананаўскае панаваньне.**

У цяперашні час савецкая ўлада ўстаноўлена на тэрыторыі больш чым 167 паветаў, што складае **каля адну пятую частку ўсяго Кітаю.** У гэты лік не ўваходзіць вялізарная колькасьць паветаў, дзе шырока разьвіт партызанскі рух, але дзе моцная яшчэ ўлада гаміндану і дзе барацьба яшчэ не прывяла да захвату і перадзелу памешчыцкай зямлі і ўстанаўленьня ўлады выбарчых саветаў. Савецкія раёны — гэта ня суцэльная тэрыторыя, а рад буйных і дробных астравоў, раскіданых у Цэнтральным і Паўднёвым Кітаі.

Ёсьць тры буйныя стабільныя савецкія раёны.

Хунань-Хубэйскі савецкі раён, які ахапляе больш 29 паветаў з 30 млн. насельніцтвам. Савецкая ўлада арганізавана пасьля ўпартай партызанскай барацьбы ў пачатку 1930 г. спачатку ў двух, а потым і ў іншых 12 паветах. У арганізацыі гэтага савецкага раёну вялізарная роля належыць гарнякам пінсянскіх капальняў, якія далі асноўны пралетарскі касьцяк Чырвонай арміі і органам савецкай улады. У лістапі 1930 г. адбыўся першы зьезд саветаў гэтага раёну.

На стыку трох правінцый: **Хубэй, Хэнань, Ань-Хой** размешчан другі раён, на тэрыторыі якога ў найбольш яго стабільнай частцы пад уладай саветаў знаходзіцца **12 паветаў з 15 млн. насельніцтва.** Савецкая ўлада тут арганізавана ў канцы 1929 г.

Цзянсійскі раён, найбольш магутны. Ён лічыцца цэнтральным і размешчан на паўднёвым-заходзе сутоць Цзянсі і поўначы Гуандуні. Яго мяжа ў сучасны момант роўна 4.500 кілёмэтраў, куды ўваходзяць **23 паветы з насельніцтвам больш 50 млн. чалавек.** Савецкая ўлада тут створана на базе партызанскага руху яшчэ спачатку 1928 г. адступаўшымі сюды кантонскімі рабочымі атрадамі і вайсковымі часьцямі разгромленай імпэрыялістамі Хайлудынскай савецкай рэспублікі. Упершыню савецкая ўлада была створана ў павеце Ніцытан.

Пасьля зьезду, які аб'яднаў усе пазітовыя атрады Чырвонай арміі ў адзін магутны полк, захапляецца вялікі горад Дунгу, які стаў сталіцай саветаў. Савецкая ўлада пашыраецца на рад новых паўстаўшых паветаў: Жугао, Тайсін, Паньтунь і інш. Летам 1930 г. Чырвоная армія радам апэрацый разграмляе правінцыяльныя гаміндананаўскія войскі і захапляе адзін з галоўных гарадоў правінцыі г. Цзіань, а восьпьню Чырвоная армія ўжо пагражала сталіцы Нанчану.

Посьпехі Чырвонай армії, разграміўшай правінцыяльную армію, устрывожылі панкінскі ўрад, які арганізаваў першы паход у канцы 1929 г., пасьлаўшы больш 100.000 салдат пад камандай **нямецкіх фашыстаў-афіцэраў і забясьпечаных амэрыканскай зброяй.** Пасьля частковых посьпехаў, гаміндананаўскія войскі пад напорам Чырвонай армії вымушаны былі адступіць, **страціўшы пяць дывізій.** Чырвоная армія выйшла з гэтых баёў умацаванай, упершыню атрымаўшы буйныя ваенныя трафэі, дазволіўшыя пераўзброіць армію, якая да гэтага часу ў асноўным мела халодную і шомпальную зброю.

Другая карная экспэдыцыя ў складзе 20 дывізій, арганізаваная адразу-ж пасьля разгрому першай у сакавіку 1931 г. таксама пракалілася.

Трэці паход Чан Кай-шы, пачаты ў чэрвені 1931 г., таксама ў асноўным быў накіроўваны супроць Цзянсійскага савецкага раёну. Пасьляховае правядзеньне перадзелу зямлі, выпраўленьне памылак у перадзеле зямлі, разгром упутраной контр-рэвалюцыі і, нарэшце, умацаваньне савецкай улады на мясцох, якое забясьпечвае падтрыманьне серадняцкіх пластоў вёскі, дазволіла рэарганізаваць вайсковыя сілы, паладзіць снабжэньне і даводзіць склад армії да 120.000 байцоў з 37.000 баявых вінтовак. На гэты раз супроць чырвоных была кінута армія ў 300.000 салдат, куды ўвайшлі лепшыя гвардзейскія дывізіі пад камандай ваенміна Хоінцына, з задачай не раскідвацца, а ўзяць у «мяшок» Чырвоную армію Цзяньсі, або вычпаць яе ў Гуандуні. Генэралу Хоінцыну ўдалося захапіць сталіцу Саветаў — Дунгу, спаліць яе канчаткова, а працоўнае насельніцтва зьнішчыць. Чырвоная армія адступіла ў гарысты Фуцзян. Але далей націск белых выдахся. Гарыстая мясцовасьць, дажджы, бездарожжа, паводкі, адсутнасьць харчаваньня, адрыў ад баз, варожасьць насельніцтва і пастаянныя налёты партызанскіх часьцей стамілі і дэзарганізавалі працоўніка. Пачаліся паўстаньні і пераходы на бок чырвоных цэлых часьцей працоўніка.

І калі Чырвоная армія ў жніўні 1931 г. перайшла ў наступленьне, белыя хутка ачысьцілі ўсю, узятую раней тэрыторыю, страціўшы 25 тыс. вінтовак, шмат кулямётаў. У гэтых баёх **белыя страцілі 17 дывізій,** якія былі растрошаны і выведзены са строю Чырвонай армії.

У разгар японскай інтэрвэнцыі перад тварам вонкавага ўварваньня прадажны гаміндан адчыняе дзьверы ў Кітай японскаму імпэрыялізму, зьняўшы з шанхайскага фронту войскі і кінуўшы іх супроць чырвоных. Было мабілізавана **50 дывізій.** Але і гэты чацьверты паход, які суправаджаўся гнуснымі лёзунгамі аб «амністыі» і «прызнаньні» праведзенага перадзелу зямлі таксама скончыўся крахам. Чан Кай-шы на гэты раз **страціў 35.000 вінтовак, 300 кулямётаў, звыш 100 гарматаў і 2 самалётаў.** Чырвонымі ўзят рад важных гарадоў: Нансюі, Даюй і інш. Між іншым у гэтым паходзе кітайскія войскі прабавалі атакаваць Чырвоную армію з поўдня, але былі жорстка разьбіты і хутка зьнікліся з фронту.

Пяты паход пачаўся. Перад савецкімі працоўнымі і Чырвонай арміяй Кітаю паўстаюць новыя дні цяжкіх выпрабаваньняў.

Ня глескачы на раздробнасьць і раскіданасьць савецкіх раёнаў амаль на ўсім Кітаі, у лістападзе 1931 г. быў склікан першы ўсекітайскі зьезд саветаў, які стварыў **цэнтральны савецкі ўрад.** Быў выбран ЦВК і Саўнарком. Старшынёй Саўнаркому выбран **тав. Маосзэдун,** стары камуніст, арганізатар партызанскага руху на поўдні Кітаю. Арганізавана 11 наркамагаў: **вайсковых страў, ваенна-палявы суд, сельскай гаспадаркі, працы, фінансаў, асьветы, рабочай асьветы і павышэньня кваліфікацыі, сацыяльнага забясьпячэньня, юстыцыі, камітэт па рабоце сярод жанчын і замежнай разьведкі.**

Зьезд, на якім былі прадстаўлены працоўныя масы ня толькі савецкага, але і белага Кітаю, зацьвердзіў канстытуцыю, на падставе якой эксплёатацыя, пазбаўлены выбарчых правоў, рабочым прадастаўлены больш шырокія правы прадстаўніцтва ў органах улады ў параўнаньні з іншымі пластамі працоўных. Падводзячы вынікі багацейшаму вопыту барацьбы за рэвалюцыйнае ператварэньне Кітаю, зьезд узаконіў усе галоўнейшыя заваяваньні рэвалюцыі, заклікаўшы працоўныя масы белага Кітаю да рэвалюцыйнага ажыцьцяўленьня іх.

Зьезд зацьвердзіў **беззваротную канфіскацыю** і праведзенае разьмеркаваньне паміж сялянскай беднатой і сераднякамі ўсёй зямлі фэадалаў, памешчыкаў, мілітарыстаў, тухуа, джэнтры, манастыроў і іншых буйных прыватных уласьнікаў. Кулацкія землі канфіскуюцца, але кулакі могуць быць надзелены зямлёй горшай якасьці, аднак, пры тэй умове, што яны будуць адпрацоўваць гэту зямлю ўласнымі рукамі. Забаранёны спэкуляцыю зямлёй і спробы з боку былых памешчыкаў вярнуць сваю зямлю назад шляхам куплі, зьезд дазволіў працоўнаму сялянству куплю, продаж і здачу зямлі ў арэнду паміж сабою.

Прыняты закон аб працы ўстанаўляе **8-гадзінны рабочы дзень для дарослых і 4-6 гадзінны для дзяцей і падросткаў, увядзіць мінімум зарплаты, ахову працы, асабліва жанчын і дзяцей, абавязковасьць калдагавароў, забарону сыстэмы падрадчыкаў, сацыяльнае страхаваньне і арганізуе фабрычную інспэкцыю.**

Ганаровае права са зброяй у руках абараняць краіну саветаў і вызваліць увесь Кітай ад імпэрыялістаў, мілітарыстаў і крывавай фэадальна-буржуазнай эксплёатацыі зьезд прадаставіў толькі рабочым, батраком, бедняком, серадняком і гарадзкой бедноце. **Створан рэвалюцыйны савет і галоўны штаб кітайскай Чырвонай армії.** Старшынём рэвалюцыйнаму савету і парком ваенных спраў прызначан **тав. Чу-дэ,** стары камуніст, адзін з арганізатараў кітайскай Чырвонай армії.

У мэтах разьвіцьця і ўмацаваньня рэвалюцыйнага саюзу рабочых і сялян зьезд саветаў прыняў закон аб эканамічнай палітыцы.

У галіне прамысловасьці ўсе прадпрыемствы кітайскіх капіталістаў не замешаныя ў контр-рэвалюцыйнай барацьбе з саветамі, савецкі ўрад пакідае ў руках іх ранейшых уласьнікаў, але ажыцьцяўляючы рабочы кантроль над вытворчасьцю праз фабзаўкомы, або прафсаюзы. Маемасьць імпэрыялістаў падлягае націяналізацыі і можа быць прадастаўлена замежным прамыслоўцам толькі ў парадку канцэсыйнага дагавору, але пры ўмове выкананьня савецкіх законаў аб працы.

У галіне гандлю савецкі ўрад ня ўмешваецца ў штодзённыя рынкавыя адносіны, аднак, нераскае спэкуляцыю. Гандлёвыя палаты і іншыя арганізацыі капіталістаў распушчаны. Устанаўляецца кантроль над замежным гандлем, прычым на вываз срэбра патрабуецца дазвол савецкага ўраду.

Вызваліўшы рабочых, гарадзкую і вясковую беднату і сем'і чырвонаармейцаў ад падаткаў, зьезд саветаў устанавіў адзіны прагрэсыўны падатак, увесь цяжар якога падае на буржуазію.

Нацыянальна-рэвалюцыйная вайна, якая разьвіваецца супроць японскага і міжнароднага імпэрыялізму, забастовавая барацьба і адгэтуль падтрымане савецкіх раёнаў пралетарамі і сялянамі ў буйнейшых гарадох і раёнах гаміндананаўскага Кітаю — служыць моцнай заручкай новых посьпехаў у баёх слаўнай Чырвонай армії.

Разгортваючы масавую рэвалюцыйную работу, выкрываючы «новы праект па зямельным пытаньні», растлумачваючы масам на канкрэтных прыкладах чатырох вярных экспэдыцый контр - рэвалюцыйную сутнасьць новага пляну барацьбы з саветамі, умацоўваючы і аб'яднаючы Чырвоную армію і ўсе масавыя ўзброеныя арганізацыі рэвалюцыі, кампартыя на чале пралетарыяту здолее выкаваць гэты новы будучы посьпех кітайскай рэвалюцыі і ў барацьбе з контр-рэвалюцыйным гамінданам і імпэрыялізмам.

АСУШАНЫЯ БАЛОТНЫЯ МАСЫВЫ ПЕРАТВОРЫМ ВА ЎЗОРНЫЯ ГАСПАДАРКІ ВЫСОКІХ УРАДЖАЯЎ



Балотныя абшары па БССР займаюць 2.600 тыс. га. Вяўкі, дзікія кабаны ды козы—вечныя спадарожнікі Палесься. Ня ступала нага чалавека на дрыгву. Толькі дзені-дзе на астраўках капаўся паляшук...

На здымку: Мар'інскія балоты ў мінулым.

Выкарыстаць торф на падсьціл

Падняць ураджай на ўзараных падзолах і пяшчаных землях можна толькі пры ўнясеньні арганічнага ўгнаеньня. У той час як гною ў нас не хапае, мы яшчэ дагэтуль мала зьвярнулі ўвагі на скарыстаньне торфу, які, паводле даных дасьледчых установаў, адыгрывае вялікую ролю ў павышэньні ўраджайнасьці.

На мясцох выкарыстаньне торфу на ўгнаеньне да гэтага часу з боку саўгасаў і калгасаў недацэньваецца. Эфект тарфянота ўгнаеньня даказан практыкай раду дасьледчых установаў і перадавых саўгасаў і калгасаў. Па даных Ціміразеўскай сельска-гаспадарчай акадэміі, ураджай жыта з аднаго гэктару складае: без угнаеньня 8,25 цэнтн., па тарфяным гнаі — 13,6 цэнтн. і па саломістым — 11,8 цэтн. Ураджай на тарфяным гнаі вышэй чым на саломістым для збожжавых культур у сярэднім на 10—15 проц., а для бульбы і кораніплодаў — на 25—30 проц.

Торф, асабліва на пяшчаных глебах, зьяўляецца незаменным сродкам падняцьця ўраджаю. Апрача жыўленьня расьлін, торф у зборані палепшае фізычныя ўласьцівасьці глебы. Ён павялічвае вільготнасьць глеб, павышае здольнасьць глебы ўтрымліваць і ўсвойваць мінэральныя ўгнаеньні.

На ўгнаеньне тарфяных балотаў могуць быць выкарыстаны па рознаму ў залежнасьці ад характару таго ці іншага балота. Для прыгатаваньня падсьцілкі з мохавага балота нарэзаюць з верхняга пласту торфу цагліны, даўжынёй 30, шырынёй 15 і вышынёй 10 см. Рэзка торфу робіцца восеньню. Нарэзаныя пліткі складаюцца для прасушкі ў клеткі, вышынёй 3—4 мэтры, на сухім высокім месцы. Пасьля сушкі торф складаецца пад навець, або ў пуню, адкуль ён бярэцца для падсьцілу. Пры ўжываньні на падсьціл пліткі дробяцца на штыфтавых малатарнях, або крышацца іншымі прыладамі.

Перавага торфу, як падсьцілкі, даволі значная. Торф лепш чым салома затрымлівае гнаявую жыжку і аміяк, які атрымліваецца пры раскладзе гною. Такім чынам тарфяны гной больш багаты азотам у параўнаньні са звычайным. Досьлед паказаў, што гной саломістай падсьцілкі пасьля 6 месяцаў хаваньня траціць 20 проц. азоту, а тарфянай падсьцілкі — толькі 7,4 проц.

У гэтым годзе мы вымушаны зьвярнуць асаблівую ўвагу на загатоўку торфу для падсьцілку таму, што ў радзе раёнаў, дзе аўсы былі пашкоджаны іржаўчынай, ёсьць значны недабор прубых кармоў — яравой саломы. Жытняя салома, бязумоўна, павінна быць уключана ў кармовы балянс. Адсюль такі вывад, што калгасы некаторых раёнаў саломістай падсьцілкай будуць забясьпечаны на 40—50 проц.

Каштоўная якасьць тарфянай падсьцілкі і прытым эканомія саломы для корму прымушае зьвярнуць на тарфяную падсьцілку сур'ёзную ўвагу. Тарфяная падсьцілка ў 1933 г. павінна зьяўляцца адным з фактараў павышэньня ўраджаю. Неабходна раз-жа разгарнуць масавую работу сярод рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў — аднаасобнікаў аб падрыхтоўцы торфу для падсьцілу.

Аграном ВАСІЛЬЛЕЎ.



Савецкая ўлада актыўна ўзялася за асушку балот. Асынчуюцца сродкі, распачынаецца ўпартая барацьба з балотнай стыхіяй. За апошнія 6-7 год мэліяравана плошча ў 112 тыс. га.

На здымку: магістральны канал на Мар'інскім масыве.

10 ТОН КАНАПЕЛЬ З ГЭКТАРА

Па Савецкім саюзе ў гэтым годзе на навукова-дасьледчыя работы асыгнавана 646 млн. руб., з якіх 170 млн. руб. на капітальнае будаўніцтва. Гэта больш, як паўмільярдная лічба асыгнаваньняў сьведчыць аб тэй вялікай увазе, якую партыя і савецкая ўлада аддаюць навукова-дасьледчай справе.

Але-ж каму шмат даецца, з таго шмат і патрабуецца. Навукова-дасьледчыя ўстановы павінны вырашаць цэлы рад новых праблем і задач у галіне прамысловасьці і сацыялістычнага зямляробства. Таму сродкі павінны быць скарыстаны з найбольшым эфэктам для пралетарскай дзяржавы.

На справе-ж некаторыя навукова-дасьледчыя ўстановы значную долю асыгнаваньняў выдаткоўваюць, трэба сказаць, зусім неахай на і часта толькі з-за сваёй недагаворанасьці з гаспадаркамі, на тэрыторыі якіх праводзяцца досьледы.

Для прыкладу можна прывесьці ўсесаюзны навукова-дасьледчы балотны інстытут, які праводзіць досьледы ў саўгасах імя 10-годзьдзя БССР і «Загальле». Да прыезду навуковых працаўнікоў адміністрацыя гэтых саўгасаў ня ведала, якія досьледы будуць ставіцца на іх тэрыторыі, іх аб'ём і г. д. Пры складаньні вытворча-фінансавых плянаў саўгасы зусім ня ўлічылі ні плошчы, на якой павінны праводзіцца досьледы, ні рабочай і цягавай сілы.

Вясною, (як сьнег на галаву дырэкцыі) ў саўгас імя 10-годзьдзя БССР зьяўляюцца навуковыя працаўнікі балотнага інстытуту і горацкай зональнай станцыі для вывучэньня розных пытаньняў. Усяго з практыкантамі прыехала каля 25 чал. Усім працаўнікам для закладкі сваіх досьледаў патрабавалася рабочая і цягавая сіла, а гэта яраз плянам саўгасу ня прадугледжана.

Такая няўвязка паміж дасьледчыкамі і дырэкцыяй саўгасу адбіваецца на якасьці дасьледчай работы. Несвоячасовасьць закладкі вопытаў не дае пажаданых вынікаў у гэтай справе.

Так, напрыклад, не пасоўваецца наперад справа ў саўгасе імя 10-годзьдзя БССР са ступеньню асушкі адкрытымі каналамі. Вопытны вучастак па гэтым пытаньні ў саўгасе закладзен яшчэ ў 1928 годзе, на якім і па сёньняшні дзень вядуцца назіраньні за ражымам грунтовых вод. Аднак і зараз нельга цьвёрда сказаць саўгасу, якія-ж нарэшце адлегласьці паміж каналамі даваць, каб атрымаць ураджай да 10 тон канапель з га. А прафэсар Кірсанаў лічыць, што такі ўраджай на Мар'інскіх балотах можна атрымаць.

Спэцыяліст па гідратэхніцы балотнага інстытуту тав. Кажанаў у сваёй кнізе, якая нядаўна выпушчана БДВ, раіць даваць адлегласьці паміж каналамі на Мар'інскіх балотах пад тэхнічныя культуры ў 65 мэтраў. Ні аднаго ўраджаю са свайго вучастку тав. Кажанаў ня ўлічыў і лічбаў ураджайнасьці ў сваёй кнізе не падае. У канцы кнігі ён дзлае, быццам гэтыя адлегласьці на канчатковыя і падлягаюць далейшаму вывучэньню з апошнім, напэўна, трэба згадзіцца, але дзе-ж вынікі працы з 1928 году?

Саматужніцтва, распылеласьць у дасьледчай справе, нядобраякасная і несвоячасовая закладка вопытных вучасткаў цілей непрыймімы, інакш гэта дарэмная трата дзяржаўных сродкаў.

Неабходна сканцэнтраваць дасьледчую працу па галінах, або па комплексах вывучаемых пытаньняў, абсталяваць дасьледчыя пункты самымі неабходнымі прыладамі і лябараторыямі. Тады будуць вынікі, якія патрэбны нам.

У прыватнасьці, задача высунутая праф. Кірсанавым — 10 тон канапель з гэктара на Мар'інскіх балотах—зусім рэальная. Вопыты 1932 году, калі мы маем выпадкі росту канапель у вышыню 2½-3 мэтры, даюць упэўненасьць у рэальнасьць гэтага ўраджаю.

Калі ў 1928-29 гадох у саўгасе імя 10-годзьдзя БССР толькі падрыхтоўваліся вопытныя вучасткі, то ў 1930 годзе было ўжо занята 10 гэктараў пад гэтыя вучасткі, у 1931 годзе—30 гэктараў і ў 1932 годзе — 60 гэкт. На 1933 год запраектавана 100 гэкт.

Аднак дасьледчая справа, якая зараз разьвіваецца, можна паставіць саўгас у цяжкае становішча з рабочай сілай і памяшканьнямі як для сушкі вопытнага ўраджаю, так і жыльлёвымі будынкамі.

Трэба саўгас імя 10-годзьдзя БССР—гэту буйную балотную гаспадарку—ператварыць ва ўзорную ўсесаюзную школу па культуры балот з дзяржаўнымі дасягненьнямі на пастаноўку дасьледчай працы. Толькі пры такіх умовах магчыма будзе хутчэй дабіцца ўраджаю канапель на балоце ў 10 тон з га.

Работнікі ўсесаюзнага навукова-дасьледчага балотнага інстытуту Кержанеўскі К., Парахневіч П.

П. С. Трус

ХЭМІЗАЦЫЯ БАЛОТНЫХ ЗЯМЕЛЬ

Шырокае асваеньне балотных масываў у другой пяцігодцы для сельска-гаспадарчага выкарыстаньня адыграе вялікую ролю ў разьвіцьці прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі Саюзу.

Першыя крокі па асваеньні балотных масываў і іх выкарыстаньні ўжо зроблены. Вопыт паказаў, што на балотных глебах пры правядзеньні адпаведных мерапрыемстваў можна атрымаць надзвычайна добрыя ўраджаі: ураджай ячменю дасягае 40 цэнтн., канапель-трасты—80 цэнтн., бульбы—225 цэнтн., сена—100 цэнтн.

Пры асваеньні балотных масываў пасьля іх асушкі пад сельска-гаспадарчыя культуры надзвычай важна ведаць тэхнічныя прыёмы ўзьдзейнасьці на балотную глебу з мэтаю атрыманьня найбольшай колькасьці карыснага прадукту.

Арганізацыя саўгасаў і калгасаў гэтых мэліяраваных плошчах дае ўсе магчымасьці для мэханізацыі вытворчасьці, правільнай арганізацыі працы, у процілегласьць дробным фэрмэрскім гаспадаркам у буржуазных краінах, дзе аб шырокай мэханізацыі і аб іншых мерапрыемствах ня прыходзіцца і думаць.

Да сыстэмы агра-тэхнічных мерапрыемстваў адносіцца мэханізацыя, апрацоўка глебы, севазвароты, палепшаныя гатункі, хэмізацыя і інш.

Адно з важных месц займае хэмізацыя балотных глеб. Балотныя глебы як па сваім паходжаньні, так па фізыка-хэмічных і біялягічных уласьцівасьцях адрозьніваюцца ад мінэральных глеб, і таму яны патрабуюць асобных ад мінэральных глеб спосабаў узьдзейнасьці на іх.

Адносна арганічных угнаеньняў на балотных глебах клапаціцца ня прыходзіцца, бо яны самі багаты на арганічную матэрыю. Калі і прыходзіцца ўжываць гной на балотных глебах, дык ён ужываецца ў большасьці выпадкаў для заражэньня балотнай глебы бактэрыямі з мэтай выклікаць больш бактэрыяльныя працэсы.

Праведзеная дасьледчымі ўстановамі работа па ўжываньні ўгнаеньня на балотных глебах дае поўныя падставы для правільнага ўжываньня іх.

Дасьледамі ўстаноўлена, што для лугавых мяшанак (штучныя сенажаці) найбольш выгаднымі досамі зьяўляюцца: 40-60 кгр. P_2O_5 (фосфару) і 90 кгр. K_2O (калій) на га. Дабаўка азоцістых угнаеньняў нязначна павышае ўраджай. Фасфарыт зьяўляецца эфэктным, калі ён уносіцца на сенажацях з восені. Пад бульбу на балотных глебах аказаліся лепшымі нормамі 60 кгр. P_2O_5 і 120-150 кгр. K_2O на га.

Асноўным пытаньнем, якое патрабуе хутчэйшага вырашэньня, зьяўляецца вызначэньне патрэбы балотных глеб ва ўгнаеньнях пад асобныя культуры.

Практыка сельскай гаспадаркі патрабуе поўнага, у кожным канкрэтным выпадку адказу, у якіх угнаеньнях адчувае патрэбу балотны масыў, які асвойваецца для сельска-гаспадарчых мэт.

Адно каротка-тэрміновае праветрываньне глебы павялічвае колькасьць водарастваримых фосфару і азоту і павышае ў вэгэтацыйных досьледах ураджайнасьць.

Напрыклад, водарастваримай фосфарнай кіслаты павялічваецца на 49 проц., а аміяка ў 7 разоў ад каротка-тэрміновага (месяцівеннага) праветрываньня торфу з Камароўскага нізіннага балота каля Менску, параўнальна з неправетраным.

Адгэтуль напрашваецца практычнае пытаньне аб каротказтэрміновым праветраньні, прыкладна ад уборкі ўраджаю да пачатку замаразкаў.

Асабліва добрыя вынікі атрымалі з кіславаньнем торфу Барабінскіх балот (Заходняя Сібір) са слаба-шчолакавай рэакцыяй. Тут ад кіславаньня атрымалася значная прыбаўка ўраджаю аўса ў вэгэтацыйных досьледах.

Так, напрыклад, сярэдняя апульная вага надземнай масы з двух сасудаў: без угнаеньня—1,59 грам; серкавая кіслата з разьліку 30 куб. сантым. 10 норм на 820 грам абсалютна сухой глебы—17,08 грам; КР№ (калі фосфар, азот)—30,35 грам; КР№) + серкавая кіслата—58,5 гр..

Гэта толькі папярэднія даныя, далёка няпоўныя сродкі для актывізацыі і поўнага выкарыстаньня прыродных запасаў спажыўных матэрый, якія знаходзяцца ў глебе ў цяжка даступным ці недаступным для расьлін стане.

Рэакцыя балотных глеб вагаецца ў значных межах ад моцна кіслай да шчолакавай. Як на кіслых, так і на шчолакавых глебах культура не магчыма. Таму вывучэньне шкодлівай для росту расьлін кіслотнасьці і шчолачнасьці балотных глеб і спосабаў іх нэйтралізацыі з мэтай павышэньня ўраджайнасьці зьяўляецца вельмі важнымі пры асваеньні балотных масываў. Вывучэньне ўжываньня розных відаў мінэральных угнаеньняў дасьць магчымасьць ня толькі павысіць ураджайнасьць, але і палепшыць якасьць прадукту.

Вывучэньне мер барацьбы з хваробамі сельска-гаспадарчых расьлін, якія культывуюцца на балотных глебах хэмічнымі сродкамі, зьяўляецца таксама важным пытаньнем. Напрыклад, глебавая хвароба «апрацоўкі», якая перашкаджае ўзрошчываньню раду сельска-гаспадарчых расьлін на балотных глебах. Адзнакі гэтай хваробы такія: расьліна моцна кусьціцца, падсыхаюць кончыкі лісьцяў, зёрне адсутнічае, а іншы раз расьліны зусім засыхаюць і гінуць.

Досьледамі Балотнага інстытуту высьветлена, што ў значнай ступені дапамагае весьці барацьбу з гэтай хваробай медзяны купарвас. Пры ўнясеньні на балотную глебу, дзе ёсьць глебавая хвароба «апрацоўкі» медзянага купарвасу ў колькасьці 25 кгр. на га, атрымліваецца значнае павышэньне ўраджайнасьці.

Побач з пытаньнем хэмізацыі балотных глеб неабходна паставіць пытаньне вывучэньня бактэрыяльных угнаеньняў, з мэтай папярэджаньня выпаданьня з травяных мяшанак бабовых расьлін, што часта назіраецца на практыцы.

Вось кола асноўных пытаньняў, якія вырашаюцца Усесаюзным Балотным інстытутам у сыстэме з іншымі пытаньнямі, з мэтай палягчэньня асваеньня балотных масываў для сельска-гаспадарчага выкарыстаньня ў другую пяцігодку.

Работа па хэмізацыі ў комплексе з іншымі апратэхнічнымі мерапрыемствамі дасьць магчымасьць атрымаць на мэліяраваных балотных масывах высокія ўстойлівыя ўраджаі, асабліва кармовых і тэхнічных культур.

У сувязі са значнай плошчай балотных масываў, якія прызначаны для асваеньня пад сельска-гаспадарчыя культуры, важнасьцю пытаньня хэмізацыі балотных зямель з мэтай павышэньня ўраджайнасьці, і асобна для паўнаты ахопу ўсіх пытаньняў па хэмізацыі, трэба было-б лічыць своячасовай арганізацыю пры ўсесаюзным навукова-дасьледчым балотным інстытуце сэктару па хэмізацыі балотных зямель.

На асушаных балотных масывах атрымліваюцца высокія ўраджаі, асабліва тэхнічных і кармовых культур. Ураджай з аднаго гэктару: па каноплях (семі)—6 цэнт., турнэпсу—300 цэнт., рэпе—300 цэнт., бульбе—102,6 цэнт., капусце—183 цэнт., жыце—12, аўсу—12 цэнт., ячмені—10,8 цэнт.

На здымку: ураджай жыта і капусты на Мар'інскіх балотах.

Акад. В. Шчарбакоў

ЭКСПЭДЫЦЫЯ Ў ПАЛЕСЬСЕ

Савецкая навука, за час існаваньня дыктатуры пралетарыяту, абагацілася надзвычай вялікімі і каштоўнымі вынаходзтвамі і адкрыцьцямі. У яе пятнаццацігадовую гісторыю ўпісаны новыя яркія старонкі дзейнасьці вучоных, аддаючы свае сілы на карысьць пралетарыяту і працоўных мас сялянства. 15-цігадовая гісторыя Кастрычніцкай рэвалюцыі зьяўляецца багацейшым адрэзкам часу ў адносінах навуковай творчасьці ў нашай краіне.

У сыстэме мерапрыемстваў, якія праводзяцца навуковымі ўстановамі Савецкага саюзу асабліва выдатнае месца займаюць навуковыя экспэдыцыі. Неабсяжныя абшары нашага Саюзу захоўваюць у сваіх нетрах і на паверхні багацейшыя, яшчэ далёка не дасьледаваныя прыродныя багацьці і карысныя выкапні. Многае ўжо адкрыта нашай савецкай навукай і, будучы адкрытым, пыротка скарыстоўваецца ў практыцы будаўніцтва, нашай індустрыі і сельскай гаспадарцы. Але яшчэ больш багацьцяў схавана ад нашага вока.

Дзесяткі і сотні навуковых экспэдыцый праведзеныя навуковымі ўстановамі па дасьледаньні і адкрыцьці новых прыродных рэсурсаў. На далёкай Поўначы і Ўсходзе, у паўдзёвых стэпных абшарах і горах пабывала ні адна сотня, нават ні адна тысьча савецкіх вучоных. Ужо вялізарныя абшары нашай тэрыторыі і перш за ўсё нашых акраін дасьледаваны навуковымі ўстановамі па заданьнях Савецкай улады. Савецкія дзеячы навукі шукаюць таго, у чым мае патрэбу наша прамысловасьць і сельская гаспадарка, прамысловыя гіганты, саўгасы і калгасы. Тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва маюць патрэбу ў новым сырцы, у ня вялічаных яго запасах. Задача другой пяцігодкі патрабуе яшчэ большага напружаньня работы па дасьледваньні сырцовай базы для нашай цяжкай і лёгкай прамысловасьці.

Асабліваасьць савецкай навукі — гэта яе сувязь з практыкай, гэта яе работа для сацыялістычнага будаўніцтва. Але ёсьць яшчэ іншыя яе асабліваасьці, ня менш важныя і ўласьцівыя толькі савецкай навуцы. Гэта супрацоўніцтва вучоных з шырокімі пралетарскімі масамі ў справе вырашэньня пастаўленых перад навукай задач. Справа заключаецца ня толькі ў тым, што нашы кадры навуковых работнікаў з году ў год папаўняюцца ўсё новымі і новымі работнікамі, выхаддамі з пралетарскага і паўпралетарскага асяродзьдзя, але і ў тым, што самі масы ў працэсе выкапаньня сваіх вытворчых плянаў робяць надзвычай многае для разьвіцьця савецкай навукі ў справе вырашэньня разам з навуковымі работнікамі важнейшых і складаных праблем. Яны разам з савецкімі вучонымі абагачаюць савецкую навуку, рухаюць яе наперад па шляху, указаным вялікім Кастрычнікам. Успомнім масавае вынаходніцтва рабочых, работу кралязнаўчых арганізацый, дзе прымаюць удзел тысячы рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, і мы згадаемся з гэтым.

У правядзеньні навуковых экспэдыцый маса адыгрывае асабліва вялікую ролю. Вяр ней будзе сказана, што мы зараз бяз масы ня здольны былі-б вырашыць тыя вялікія задачы, што высоўваюцца перад нашымі навуковымі экспэдыцыямі.

Масы часта сваімі ўказаньнямі дапамагаюць вучоным у адкрыцьці багацьцяў, захаваных у нетрах зямлі. Яны наведамляюць аб каштоўнейшых даных, аб выкапнях, яны самі непасродна на сваёй уласнай ініцыятыве, прымаюць удзел у досьледах.

Ва ўсім гэтым мы павінны бачыць рэальныя крокі ня зблізаньні навукі з фізычнай працай, па зьнішчэньні бездані між фізычнай працай і разумовай.

Палеская экспэдыцыя, праведзеная Саюзнай акадэміяй разам з Беларускай ў чэрвені, ліпені г. г. у раёнах Палесься, заслугоўвае асаблівай увагі. Яе работа перш за ўсё каштоўна па практычных розультатах для нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Палеская экспэдыцыя зьяўляецца пакуль першай, адзінай у Савецкай Беларусі па важнасьці тых задач, якія былі перад ёй пастаўлены. Упярыньню па тэрыторыі БССР мы маем супрацоўніцтва дзьвёх акадэмій у вырашэньні дасьледчых задач. Гэта супрацоўніцтва знайшло сваё выяўленьне ў правядзеньні раду навуковых пытаньняў, пытаньняў культурнага будаўніцтва.

Палеская экспэдыцыя, працуючы пры ўдзеле 28 навуковых работнікаў васьмі спэцыяльнасьцяй, атрымала вялізарнейшы вопыт у правядзеньні ўсебаковага дасьледваньня пэўнай часткі тэрыторыі БССР.

Гэта экспэдыцыя набыла вялізарнейшы вопыт і ў справе прыцягненьня працоўных мас да навуковых дасьледваньняў.

Ад мясцовых арганізацый і работнікаў мы мелі непасродную дапамогу ня толькі ў выглядзе работы спэцыяльных камісій, створаных на мясцох для аказаньня дапамогі брыгадам экспэдыцыі, але мы атрымалі на мясцох багацейшы матар'ял, каштоўнейшыя ўказаньні адносна карысных выкапняў палескай прыроды і яе багацьцяў, вельмі патрэбныя даныя адносна прамысловасьці, калектывізацыі, клясавай барацьбы, культурнага будаўніцтва, захворваньняў, настрою мас, помнікаў матар'яльнай культуры, падзей грамадзянскай вайны ў Палесьсі. Створаныя ў раёнах камісіі правялі вялікую работу разам з брыгадамі экспэдыцыі па самых рознастайных пытаньнях. Яны зрабілі шмат у падшуканьні і падборы неабходных архіўных матар'ялаў. Рабочыя, калгасьнікі, дактары і аграномы аказалі значную дапамогу сваімі парадамі, справкамі, паведамленьнямі, успамінамі запаўненьнем анкет.

У гэтым іх вялізарная заслуга, у гэтым іх высокая палітычная і культурная сьвядомасьць.

Экспэдыцыя амаль за два месяцы свайго знаходжаньня ў Пінскім, Тураўскім, Жыткавіцкім і Лельчыцкім раёнах правяла вялікую работу. Яна сабрала шмат матар'ялаў па ўсіх галінах жыцьця і будаўніцтва Савецкага Палесься, па пытаньнях сырцовых рэсурсаў і прыродных багацьцяў Палесься. Гэтыя матар'ялы дазволяць вырашыць цэлы рад важнейшых праблем: сырцовыя рэсурсы Палесься і іх практычнае выкарыстаньне для нашай прамысловасьці, глебы Палесься з пункту погляду спэцыялізацыі раёну, мясцовасьці Палесься і шляхі іх рэканструкцыі, калектывізацыя ў Палесьсі, рыбаводзтва, яго цяперашні стан і перспэктывы дальнейшага разьвіцьця, клясавая барацьба ў сучасным вёсцы Палесься, праблемы культурнай рэвалюцыі, рэлігійных настрояў і антырэлігійная барацьба, асаблівасьці грамадзянскай вайны ў Палесьсі, характар захворваньняў і арганізацыя аховы здароўя, антрапалёгічныя асаблівасьці насельніцтва Палесься, рэканструкцыя быту і інш.

Сабраны матар'ял і праведзеная навуковая работа ў Палесьсі дадуць магчымасьць напісаць рад нарысаў па гісторыі саветаў Палесься, мадыцынскай працы, культурнага будаўніцтва, разьвіцьця прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Праведзеныя досьледы па пытаньнях сырцовых рэсурсаў, шляхоў зносін і гаспадарчага будаўніцтва паслужаць асновай для распрацоўкі другой пяцігодкі па 3-му Палескаму эканамічнаму падраёну БССР. І ўжо зараз матар'ялы палескай экспэдыцыі распрацоўваюцца ў Дзяржпляне.

Зараз мы можам гаварыць толькі аб папярэдніх даных, характарызуючых савецкае Палесьсе. Экспэдыцыя выявіла ў раёнах яе дзейнасьці рад каштоўных выкапняў: буры, жалязьняк у многіх пунктах, розпага роду гліны, мергель, торф, будаўнічыя пяскі і каменьні, граніт і графіт. Заслугоўваюць асаблівай увагі буры жалязьняк і гліны. Першыя ў цэлым радзе месц залягаюць пластамі, лёгка даступлымі для распрацоўкі. Ёсьць у Палесьсі вялікія запасы высокагатункавай гліны. Прамысловасьць Палесься мае вялізарныя дасягненьні ў сваім росьце за порыд існаваньня савецкай улады. Але яна мае й недахопы: слабае, а часамі і мэханічнае пізнаваньне, слабае скарыстаньне сырцовых рэсурсаў, няяк ная спэцыялізацыя і разьмяшчэньне.

Калектывізацыяй ахоплена ў Палесьсі вялікая колькасьць бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак. Ёсьць не малая колькасьць вельмі моцных калектываў, у якіх ёсьць чаму навучыцца. Кідаецца ў вочы актыўнасьць жанчын калгасаў Палесься. Машына-трактарныя станцыі, паяўнасьць цэлага роду спэцыялізаваных буйных гаспадарак, высокая ўраджайнасьць палёў многіх калгасаў—усё тое, чаго ня ведала Палесьсе ў мінулым. Але побач з гэтым у сельскай гаспадарцы ёсьць хібы ў галіне спэцыялізацыі, слабая работа ў цэлым па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і г. д.

Палесьсе вырасла, зьмяніла свой твар у многіх адносінах. Але ўсё-ж Палесьсе мае патрэбу ў вялікай дапамозе з боку навуковых і культурных сіл, нашых савецкіх спэцыялістаў і партыйных арганізацый. Рэшткі мінулага яшчэ ня зжыты ў Палесьсі. У раёнах ёсьць яшчэ значныя кадры пішасьменных. У некаторых вёсках і нават мястэчках можна сустрэць калтун, у радзе вёсак заўважаецца рэлігійнасьць. Кулацтва і іншыя антысавецкія элементы вядуць шалёную барацьбу супроць разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва ў Палесьсі. Яны скарыстоўваюць у гэтай барацьбе розныя сродкі, у тым ліку і перажыткі старога быту, рэлігію, цэмру пасобных груп працоўных.

У Палесьсі ёсьць рад вёсак вельмі адсталых параўнаньна з агульным станам і дасягненьнямі раёнаў Палесься. Гэтыя вёскі ў большасьці зачынены ў глухіх кутках сярод балот і лясоў, у веснавое разводзьдзе адрэзаны на цэлыя тыдні ад найбольш нарадавых пунктаў. Рэдка ў такія вёскі заглядаюць савецкія, партыйныя, культурныя работнікі. Ім патрэбна сыстэматычная дапамога. Будзем спадзявацца, што Савецкае Палесьсе пры нашай дапамозе, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі у бліжэйшы час пакончыць са спадчынай царызму, пераможа ўсе гэтыя недахопы. Савецкае Палесьсе расьце, будуе сацыялізм. Савецкае Палесьсе разам з усім нашым Саюзам пад кіраўніцтвам ленінскай партыі будуе сацыялізм.

Новая фашысцкая расправа над тав. Тарашкевічам

28-га лістапада г. г. У. Вільні фашысцкі клясавы суд будзе судзіць тав. Тарашкевіча Браніслава. З 1928 г. гэта пяты працэс над тав. Тарашкевічам. Першая справа, па якой судзілі тав. Тарашкевіча разам з 56 іншымі таварышамі, — гэта вядомы працэс супроць Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, па якім атрымаў ён 12 год цяжкай катаржнай турмы. Другі раз фашысцкі суд судзіў за выступленьне тав. Тарашкевіча на рабочым мітынгу ў Віленскім тэатры «Гелі-ёс»; трэці раз — за выступленьне на навятовым зьезьдзе «Грамады» ў гор. Сакольцы, і нарэшце, чацьверты раз — за справу, якая сфабрыкавана ўжо за час сяджэньня ў турме. У Грудзёнскай турме ў 1928 і 1929 годзе, дзе сядзеў тав. Тарашкевіч з іншымі грамадаўцамі, дзікія і нялюдзкія адносіны турэмнай адміністрацыі да палітзьняволеных выклікалі баявое абурэньне апошніх, якое вылілася ў бурныя выступленьні (выбіваньне вакон, зьнішчэньне мэблі ў камэрах і дэманстрацыйныя крыкі і сьпевы). Гэтыя выступленьні акрэсьлены былі фашысцкай адміністрацыяй, як бунты, арганізаваныя грамадаўцамі на чале з тав. Тарашкевічам.

Сёньня мы наярэдадні разгляду пятай судовай камэдыі над тав. Тарашкевічам.

Чаму фашысцкая зграя так жорстка і так заядла праследуе тав. Тарашкевіча?

Гэта нянавісьць датуецца не ад сёньняшняга дня. Яшчэ ў 1923 г. у першым сваім выступленьні ў польскім сойме тав. Тарашкевіч, гаворачы аб польскай акупацыі і насаджваньні асаднікаў на Заходняй Беларусі, кінуў грозное папярэджаньне, выявіўшы гнеў і нянавісьць шырокіх народных гушчаў: «З дымам пажараў пойдуць вашыя асады». Гэты сказ нарабіў шмат шуму. Польская буржуазная прэса ўзьняла дзікі вой супроць тав. Тарашкевіча. Акупанты Заходняй Беларусі ўсялякі абгаварвалі тав. Тарашкевіча, кажучы сабе, як гэта сталася, каб малады, здольны, «элегантны зўрапэйчык», былы дацэнт Петраградзкага унівэрсытэту, чалавек, які добра вывучыў польскую культуру і ўвесь час блізка стаяў да яе, мог так сказаць, як якійсьці «ўсходні барбажынца». Гэта ня толькі не пахіснула тав. Тарашкевіча, але яшчэ больш штурхнула яго ў рады мас змагароў за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Тав. Тарашкевіч, будучы выбраным прыгнечанымі масамі Заходняй Беларусі паслом польскага сойму, не пашоў на здраду гэтым масам. Сустракаючы на кожным кроку гвалты і тэрор акупацкай адміністрацыі, а таксама бачачы галечу і беднасьць рабочага і працоўнага селяніна, уздым іх баявой актыўнасьці, т. Тарашкевіч прышоў да пераканаяньня, што праз соймавую гаварылку нічога не пагражыцца, што канкрэтная і дадатная праца сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня можа быць толькі праца сярод самых гушч працоўных мас і праз гэтыя масы. Ілюзіі, якія існавалі ў 1922 г., хутка расьсеяліся. Тав. Тарашкевіч разам з іншымі радыкальнымі паслами беларускага пасольскага клюбу становіцца на шлях непрымірымай барацьбы з акупантамі, лічачы, што нацыянальнае вызваленьне Заходняй Беларусі прыдзе праз сацыяльнае вызваленьне працоўных мас Заходняй Беларусі і Польшчы.

„У 1925 г. тав. Тарашкевіч разам з іншымі таварышамі выходзіць з урадавога агульнабеларускага пасольскага соймавага клюбу Рагуляу, Яраміча і Станкевіча і арганізуюць беларускі рабоча-сялянскі пасольскі клюб Грамады, старшынёй якога і становіцца тав. Тарашкевіч. У выступленьнях сваіх ён ясна дэмаскуе польска-акупацкія мэтады барацьбы супроць беларускага школьніцтва, супроць тэрору на Заходняй Беларусі, а таксама дэмаскуе капіталістычна-панскую палітыку, накіраваную супроць рабочай клясы і сялянскіх мас. Гэтыя прамовы, поўныя жывых прыкладаў, білі па акупантах і заклікалі працоўных Заходняй Беларусі да арганізацыі.

У 1926 г. ён быў правадыром-старшынёй больш як статысячнай «Грамады».

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага — урад польскіх фабрыкантаў і паменчыкаў, шалёна рыгаючыся да ўзброенага нападу на Савецкі саюз, ператварэньня Заходняю Беларусь у плацдарм вайны, разграміў «Грамаду», якая стаяла на перашкодзе іх імпэрыялістычных плянаў. Грамада зьяўлялася магутнай і патражаючай сілай для белапольскіх акупантаў на Заходняй Беларусі. Брывана распраўляючыся з нацыянальна-вызвалеўчай масавай арганізацыяй — Грамадой — акупанты рукамі катарынжа Мэйштовіча, які выконваў у той час абавязкі міністра фашысцкай справядлівасьці, сотні лепшых барацьбітоў, у тым ліку і Тарашкевіча кінулі на многія гады за краты фашысцкіх турмаў.

Тав. Тарашкевіч з 15-1—1927 г. зьяўляецца палонным польскага капіталу і восьмы год ён знаходзіцца за кратамі фашысцкіх вастрогаў. Але ў турме тав. Тарашкевіч таксама ня мае супокою, ён вельмі быў папулярны сярод працоўных Заходняй Беларусі, каб фашысты пакінуў арганізоўваць вакол тав. Тарашкевіча і грамадаўцаў розныя правакацыі. Польскія фашысты пры дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў Луцкевіча, Астроўскага і К° распускаюць усялякую хлусьню, каб толькі скампрамэтаваць непахіснага барацьбіта нацыянальна-вызвалеўчага руху. Але спроба гэта не ўдалася.

І вось фашысцкі польскі ўрад пускаецца на новы манэўр. Тав. Тарашкевічу, як частцы іншых грамадаўцаў, прарываецца адбываньне кары і яго выпускаюць на волю. Гэта злосная правакацыя патрэбна была, каб кінуць цень, быццам-бы вызваленыя таварышы гатовы былі прымірыцца з фашысцкай дыктатурай з аднаго боку, і з другога, каб заглушыць нездаволеньне шырокіх працоўных мас і падарваць аўтарытэт і папулярнасьць тав. Тарашкевіча і іншых грамадаўцаў. Гэты манэўр не ўдаўся цалком. Тав. Тарашкевіч адразу зразумеў гэту правакацыю і востра запратэставаў супроць яе.

Вельмі добра памятаю апошні дзень сумеснага жыцьця ў камэры. Раніцой, яшчэ перад выдачай «кашы» прыходзіць старшы дзворца і загадвае тав. Тарашкевічу зьбіраць рэчы і выходзіць па волю. Тав. Тарашкевіч рашуча запратэставаў супроць гэтага і адмовіўся складаць рэчы. Зьбянтэжаны дзворца пабег дакладваць аб гэтым вышэйшаму начальніку, бо для яго гэта было незразумелым і хіба што першым выпадкам, каб вязень адмаўляўся выходзіць з турмы.

Тав. Тарашкевіч.

Пасьля абеду сілай прымушаюць т. Тарашкевіча пакінуць турму. Але і тут не пайшло так гладка, як хацелася-б турэмнай адміністрацыі. У кніжцы, у якой падпісваюцца вызваленыя, што ня маюць прэтэнзіі да адміністрацыі, тав. Тарашкевіч напісаў: «Нікога не прасіў і не ўпаўнаважыў мяне вызваліць. Пратэстую супроць вызваленьня. Б. Тарашкевіч».

Выходзячы за муры турмы і праходзячы перад вогнамі палітзьняволеных т. Тарашкевіч кінуў некалькі лёзунгаў, якія дружна былі падхоплены 96 палітзьняволенымі. Скончылася гэта дэманстрацыя сьпевам палітзьняволеных: «Адвеку цярпелі» і «Інтэрнацыянал».

Тав. Тарашкевіч прабыў на волі каля 10 месяцаў. Фашысцкі ўрад Пілсудзкага бачачы, што манэўр не ўдаецца, што як тав. Тарашкевіч, так і іншыя паслы Грамады і далей стаяць непахісна на шляху непрымірымай барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне працоўных Заходняй Беларусі, парашыў зноў арыштаваць тав. Тарашкевіча і інш. часова вызваленых грамадаўцаў.

Але акупантам адразу не ўдалося яго арыштаваць. Толькі праз поўны час вядомы кат Дзісьненшчыны — Скальскі пры дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў прасачыў месца прабываньня т. Тарашкевіча і ў Тчэве ў часе праезду тав. Тарашкевіча ў нямецкім транзітным вагоне, няправільна яго арыштавалі.

І вось амаль два гады тав. Тарашкевіч зноў сядзіць у адзіночцы Горадзенскай турмы. Цесная, сырая і сьмярдзючая камэра падраміла яго здароўе. Як сабакі шільна сьцерагуць яго адзіночку дзворцы. Ён ня мае ні кніжак, ні газэт і ўвесь час адзін. У свой час у Грудзенцы галадоўкай і актыўным выступленьнем дабіліся было некаторых правоў. Тав. Тарашкевіч займаўся навуковай працай і перакладаў з грэцкай на беларускую мову «Іліяду» Гамэра. А цяпер ня мае і гэтай магчымасьці. Але ўсё гэта не пазбавіла яго бадзёрасьці духу. Фізычна зморана і хворы, а духам моцны, ні доўгія годы турмы, ні прысуды, не зламалі рэвалюцыйнай волі правадыра Грамады.

Так, 28 лістапада г. г. распачнецца буржуазная судовая камэдыя. Таксама, як і ў 1928 г. выступіць рад шпікоў і правакатараў. Нейкі пракурор, падобны на судовую прастытутку, пракурора Раўзэ, які выступаў калісьці на працэсе Грамады, будзе аблiваць тав. Тарашкевіча памыямі. Беларускія нацыянал-фашысты, гэтыя верныя дапаможнікі і саюзнікі акупантаў, прыкладуць усе сілы аплёўваньня і правакацыі супроць тав. Тарашкевіча, як гэта рабілі супроць БСР Грамады. Нейкі іншы Аўсянка прыязе з Варшавы загадзя падрымгаваны і вядомы напэўна і цяпер прыгавор. Камэдыя суда будзе разыграна. Апалелы акупант, зразумела, не пашкадуе для тав. Тарашкевіча гадоў няволі.

Але прыдзе час расплаты. Рэвалюцыйная бура, раскаты грому становяцца ўсё чутней і гучней. Ні карныя экспэдыцыі, ні палявыя суды і шыбеніцы не абаронять фашысцкіх акупантаў. Кароткі, але грозны і справядлівы будзе суд пралетарыяту і прыгнечаных эксплёатаваных сялян. Тав. Тарашкевіч, як і тысячы іншых змагароў-рэвалюцыянэраў, выйдуць з-за крат не дзякуючы «гуманнасьці» акупантаў, а толькі сілай і воляй пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы.

П. МЯТЛА.

Антысавецкія правакатары за работай

ЛЮНДАН, 8. (Ад нашага карэспандэнта поштай). Па вестках, якія заслугоўваюць давер'я, Інтэліжэнс Сэрвіс, арганізуючы запытаньне ў парляманце супроць савецкага ўраду, даручыў у пачатку лістапада сваім агентам у Рызе сфабрыкаваць дакументы і матар'ялы, якія-б гаварылі аб тым, што Камінтэрн пад асабістым кіраўніцтвам тав. Сталіна арганізуе рух беспрацоўных у Англіі і падрыхтоўку грамадзянскай вайны ў Індыі. Рыскія агенты, відавочна, выканалі гэта даручэньне, бо ўжо 8 лістапада ў «Таймс» зьмешчана адпаведная тэлеграма з Рыгі ў духу паклёпу на Камінтэрн і савецкую ўладу.

Апіраючыся на паведамленьне «Таймс», сфабрыкаванае агентамі Інтэліжэнс Сэрвіс, міністэрства замежных спраў Вялікабрытаніі патрабавала ад агентаў Вялікабрытаніі ў Маскве дастаўкі якіх-небудзь дакументаў, сапраўдных або фальшывых, якія хоць-бы аддалена пацьвярджалі сфабрыкаваныя Інтэліжэнс Сэрвіс дакументы аб кіраўніцтве Камінтэрнам і яго арганізацыямі з боку савецкай улады і аб цэнтычнасьці Камінтэрну і савецкага ўраду.

Паводле паведамленьня з тых-жа крыніц, маскоўскія агенты ангельскага ўраду павінны прадставіць гэтыя дакументы ў тэрміновым парадку для таго, каб можна было мець хоць-бы бачнасьць матар'ялу для падыходзячага парляманцкага антысавецкага запытаньня з боку некаторых груп кансэрвацыйных дэпутатаў. Відавочна сам ангельскі ўрад лічыць такое запытаньне свалачкоым, каб апраўдаць задняй лічбай дэнансацыю англасавецкага гандлёвага дагавору, і тым процішаставіць гэту кампанію новай хвалі апазыцыі ў Англіі, якая ўсё больш ўмацняецца ў сувязі з дэнансацыяй гандлёвага дагавору.

Цьвёрдалобыя ўзмацняюць антысавецкую кампанію

ЛЕНДАН, 13 (Ад уласнага карэспандэнта «Правды»). За апошні час у Англіі надзвычай узмацілася антысавецкая агітацыя, якая прымае зусім недапушчальныя формы, паколькі ў ёй бяруць удзел вельмі ўплывовыя колы.

3-га лістапада група кансэрватыўных членаў парляманту заслухала даклад прыехаўшага ў Лёндан Керанскага. **Даклад меў яўна інтэрвэнцыяністкі характар.**

Маркоўчы па сёньнішніх паведамленьнях прэсы, 15 лістапада ў палаце лёрдаў прадстаіць антысавецкае выступленьне лёрда Дэнбі, які на падставе нейкіх хутка сфабрыкаваных «маскоўскіх інструкцый», зьбіраецца запытаць урад наконт таго, «ці будзе ён надалей прадстаўляць у ранейшым аб'ёме дыплёматычную недатыкальнасьць прадстаўніком Савецкага саюзу ў Лёндане».

Неабходна адзначыць, што ва ўсіх антысавецкіх выступленьнях і змовах працягваецца закулісная цесная супрацоўніцтва цьвёрдалобых з белагвардзейскім аховсьцем, як гэта мела месца ў змове з так званымі антырэлігійнымі запалкамі, этыкеткі для якіх, згодна выкрыцьцю газэты «Рэйнольдс Ілюстрэйтэд Ньюс», былі загатоўлены рускімі белагвардзейцамі ў Францыі.

Гэтымі днямі ў Лёндане выйшаў на ангельскай мове першы нумар органу Скорападзкага «Інвэстыгейтэр», **які прапануе прадаць Савецкую краіну ўсім жадаючым— гуртам і ў раздроб.** Як відаць, знаходзяцца пакупцы, якія даюць у выглядзе авансу грошы па выданьне часопісі. Невыпадкова супаў выхад гэтай белагвардзейскай часопісі з выступленьнем лёрда Ротэрміра, **які прапануе Англіі, Францыі, Германіі і Польшчы аб'яднацца для ажыцьцяўленьня антысавецкай інтэрвэнцыі з тым, каб, у прыватнасьці, кампэнсаваць Польшчу часьцямі ўкраінскай тэрыторыі за зварот польскага карыдору Германіі.**

Савецкая грамадзкасьць мае права патрабаваць спыненьня ганебнай інтэрвэнцыяністкай прапаганды ў Англіі.

Падрабязнасьці крывавых падзей у Жэнэве

Салдаты пераходзяць на бок рабочых

ПАРЫЖ. «Юманітэ» апублікавала падрабязнае паведамленьне аб падзеях у Жэнэве ў сувязі з пахаваньнем ахвяр расстрэлу. Пад націскам усхваляваных рабочых мас частка рэфармісцкіх лідэраў прымушана была пайсьці насустрач патрабаваньню кампартыі і рэвалюцыйнай прафпазыцыі — абвясьціць у Жэнэве ўсеагульную забастоўку ў дзень пахаваньня. Улада прыняла надзвычайныя меры па ахове гораду і ўвяла фактычна ў Жэнэве стан аблогі. Улада дадаткова мабілізавала некалькі тысяч салдат ваеннай міліцыі, частка якіх была выкінікана з кантону. Валіс. Жэнэва ператварылася ва ўзброены лягер. Асабліва ўзмоцнена ахоўваліся будынкі Лігі нацый, вакол якіх былі расстаўлены вайсковыя часьці з кулямётамі.

На заклік да забастоўкі адгукнуліся мэтаісты, будаўнікі і дрэваапрацоўшчыкі. Прадпрыемствы агульнага карыстаньня, гарадзкі транспарт з прычыны сабатажу рэфармістаў працавалі далей. Аднак, калі дэманстранты гвалтам спынілі і сапсавалі шмат трамвайных вагонаў, рух быў спынен і вагоны накіраваны ў дэпо. Паколькі ўлада дазволіла хаваць ахвяры расстрэлу толькі па адзіночцы, вялізарная маса дэманстрантаў, браўшых удзел у пахаваньні, была раздроблена. Усё-ж за труной загінуўшага камуніста ФОРСТА ішоў дзесяцітысячны натоўп на чале з прадстаўнікамі кампартыі.

У часе пахаваньня, як падае «Юманітэ», у горадзе адбываліся хваляваньні сярод войск. Мабілізаваныя салдаты, у тым ліку адзін жэнэўскі батальён, у знак пратэсту супроць расстрэлу рабочых, разграмілі прылегглы да казармаў выставачны палац. 7-ы і 13-ты батальёны жэнэўскіх войск атрымалі загад выступіць у Цюрых, але адмовіліся падпарадкавацца. Салдаты 13-га батальёну маршыравалі па гораду ў беспарадку з варожымі воклічамі па адрасе афіцэраў, а потым накіраваліся да турмы Сэн-Антуан, дзе пачалі братацца з рабочымі.

Калі ў Жэнэву прыбылі два выкініканыя батальёны, насельніцтва спачатку сустрэла іх варожымі крыкамі і сьвістам, але пасьля прыяцельскай гутаркі паміж салдатамі і рабочымі настрой зьмяніўся. Дысцыпліна ў нова-прыбыўшых батальёнах упала. Многія салдаты пачалі заяўляць, што ЯНЫ НЯ БУДУЦЬ СТРАЛЯЦЬ У РАБОЧЫХ.

Днём здарыўся такі выпадак. Войскі былі выстраены ў карэ і ў прысутнасьці камандзіра прымалі прысягу. Пасьля гэтага камандзір зьвярнуўся да салдат з прамоваю. Калі ён закрануў апошнія падзеі, дык з радоў войск пачуліся незадаволеныя рэплікі. Адзін салдат два разы выкрыкнуў «Забойцы», за што быў выведзен са строю. Пасьля гэтага салдаты густою сьцяной акружылі афіцэра і засьпявалі «Інтэрнацыянал».

Рух пратэсту супроць расстрэлу бяззбройнай рабочай дэманстрацыі пашыраецца і на іншыя гарады Швэйцарыі.

КРЫВАВЫЯ БАІ Ў РАЁНЕ ХАРБІНУ

БЭЙПІН, 14. Як падаюць харбінскія газэты, у дзесяці вёсках, што знаходзяцца ў 15 кілёмэтрах на паўднёвы-ўсход ад старога Харбіну, сканцэнтравана некалькі тысяч антыўрадавых войск, якія рыхтуюцца атакаваць Харбін. Кіраўнікі антыманчжурскіх войск генэралы Лі-ду і Дзін-чоў аднавілі актыўнасьць і пакінулі свае часьці. У цяперашні момант пад камандаваньнем гэтых генэралаў знаходзіцца 30 тысяч байцоў, падзеленых на дзьве дывізіі. Штаб войск Лі-ду і Дзін-чоў знаходзіцца ў Лішчы (калячатковы поўночны пункт Мулінскай веткі на ўсходняй лініі КУЧ).

Кітайскія колы Харбіну паведамляюць, што на вучастку Фулярдзі-Хурхура (на Заходняй лініі КУЧ) адбываюцца жорсткія баі. Як падае агенцтва Сімбун Рэнта, генэрал Суп Бін-вень перакідвае ў кірунку ст. Хурхура свае часьці ў дапамогу генэралу Чан Дэн-сю. Агенцтва сьцьвярджае, што ст. Хурхура занята японскімі войскамі. У баёх японцы страцілі 10 забітых і 50 параненых. Учора на перагоне Бэйшаху—Імяньпо (на ўсходняй лініі КУЧ) абстрэлян цягнік. У 2-х кілёмэтрах ад ст. Імяньпо-хунхузамі ўведзена арцель кітайскіх рабочых КУЧ у колькасьці 9 чал.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Адкрыцьцё кансэрваторыі ў БССР

15 лістапада пачаліся заняткі ў нова-арганізаванай у Менску кансэрваторыі БССР. У гэтым годзе павінна было быць прынята 85 слухачоў. У сувязі з тым, што іспыты вытрымалі толькі 40, абвешчан дадатковы набор студэнтаў.

Кансэрваторыя рыхтуе высокакваліфікаваных спэцыялістаў па раялі, віалёнчэлі, па вакальнай клясе і г. д.

Заняткі праходзяць у будынку музычнага тэхнікуму па наступных аддзяленьнях: фортэп'яна, скрыпка, віалёнчэль, сьпевы. Апрача таго, арганізуюцца аддзелы кампазытарскі, дырыжорскі, харавы і па духавых інструментах.

Дырэктарам кансэрваторыі прызначан тав. КАЗАКОЎ. Для кіраўніцтва навучальнай часткай і фортэп'янага аддзяленьня запрошан прафэсар ШЭПЭНЕЎСКІ.

Навучальныя пляны ўжо выпрацаваны і ў бліжэйшыя дні будуць прадстаўлены на зацьвярджэньне Наркамасьветы. Пэдагагічным пэрсаналам музычны ВНУ ў асноўным забясьпечан.

Усебеларускі зьезд рабочых мяса-рыбнай прамысловасьці

У клюбе харчавікоў імя тав. Сталіна адкрыўся 2-гі ўсебеларускі зьезд рабочых мяса-рыбпікаў. Мяса-рыбная прамысловасьць БССР з кожным годам усё больш павялічвае сваю ўдзельную вагу. Толькі за апошні час уступіў у строй рад новых магутных прадпрыемстваў—маргарынавы завод у Гомелі, яйка-птушны камбінат у Жлобіне і інш. Колькасьць рабочых, занятых у мяса-рыбнай прамысловасьці дасягае 6.000. На многіх прадпрыемствах шырока разгарнулася сацпаборніцтва і ўдарніцтва.

Гэтыя посьпехі ўсё-ж нельга прызнаць здавальняючымі. Доўг мяса-рыбнай прамысловасьці краіне даволі значны. За мінулыя тры кварталы ні адна з яе галін ня выканала прамфінпляну, асабліва па якасных паказальніках. Так, Белмясапрам рэалізаваў прамфінпляну толькі на 34,3 проц., плодагародная прамысловасьць—на 63,2 проц., малочна-масларобная — па сыру—на 78 проц., па маслу—на 45,1 проц. Гадавы плян улову рыбы выканан на 62,6 проц.

Прычыны адставаньня заключаюцца ў першую чаргу ў невыкананьні шасьці ўмоў тав. Сталіна. Напрыклад, толькі цяпер па мясной прамысловасьці праведзена тарыфная рэформа. Дрэнна арганізавана работа на заводах, няма выстарчальнага атэрацыйнага кіраўніцтва кожным канкрэтным вучасткам.

Толькі паасобныя прадпрыемствы—магілёўскі маслабойны завод, менскі яйка-птушны камбінат, маслабойны завод у Адарыха прышлі да зьезду з перавыкананьнем пляну.

Значная работа праведзена ў галіне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. Харчовыя канфэрэнцыі, якія адбыліся на 9 больш буйных прадпрыемствах, далі прыкметны зрух у стварэньні ўласнай харчовай базы. Пастаўлена на адкорм 550 сьвіней, ёсьць 90 кароў, 150 трусоў. Аршанскі мясакамбінат арганізаваў прыгарадную гаспадарку на 200 га. Колькасьць сталовак павялічылася з 8 да 18.

Зьезд павінен вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі адставаньня мяса-рыбнай прамысловасьці.

Тав. ФРУМКІН — міліцыянэр Гарадоцкай раёнміліцыі. Служыць у міліцыі з 1917 г., узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага сьцягу.

У Віцебску будуецца магутны кіно-камбінат

НОВЫ КІНО-КАМБІНАТ БЕЛДЗЯРЖКІНО, ЯКІ БУДУЕЦЦА Ў ВІЦЕБСКУ, БУДЗЕ МЕЦЬ ПА СВАЁЙ ВЕЛІЧЫНІ І КОЛЬКАСЬЦІ КІНО-ПРАДУКЦЫІ ВЯЛІКАЯ ЗНАЧЭНЬНЕ. КАМБІНАТ ЗЬЯВІЦЦА АДНЫМ З НАЙБОЛЬШ МАГУТНЫХ У СССР.

АГУЛЬНЫ КОШТ ЯГО КАЛЯ 6 МЛН. РУБ. БУДАЎНІЦТВА МЯРКУЕЦЦА СКОНЧЫЦЬ У 1934 ГОДЗЕ. КАМБІНАТ БУДЗЕ СКЛАДАЦЦА З КІНО-ФАБРЫКІ БЕЛДЗЯРЖКІНО, ЯКАЯ ПЕРАВОДЗІЦЦА З ЛЕНІНГРАДУ, ВУЧЭБНАГА КАМБІНАТУ І РАДУ ІНШЫХ ДАПАМОЖНЫХ КІНО-ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

Шклянкі і чарнільныя прылады з адыходаў

Бешкінтоаб'яднаньне з посьлехам праводзіць работу па ўтылізацыі адыходаў і выкарыстаньні іх для выпрацоўкі тавараў шырокага ўжытку. Так, за адзін месяц з адыходаў, якія атрымліваюцца пры выпрацоўцы экспартнага памповага шкла, выпушчана 180.000 добраякасных шклянак. Арганізован таксама выраб з адыходаў чарнільных прылад, аптэкарскага начыньня і спосабаў для электра-акумулятарных батарэй. Выкарыстаньне гэтых адыходаў, якія раней выкідваліся вон толькі па аднэй гуце «Кастрычнік» дасьць каля 200 тысяч рублёў у год.

Хроніка

*** Новая фабрыка-кухня на 5,000 абедаў адкрыта на швэйцарскім гігацце «Сьцыг індустрыялізацыі» ў Віцебску. Фабрыцы-кухні надана імя 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

*** Гомельскі вагона-рамонтны пункт прэміраваны цэнтральным журы ўсесаюзнага вагоннага конкурсу 50.000 руб. на культурна-бытавое будаўніцтва і мармуровай дошкай. Майстар пункту прэміраваны 750 руб. і граматай.**

*** ЦСПСБ прапанаваў усім ЦК і гарпрафсаветам вылучыць адказных за работу сярод ткачыхі. Склікаецца ўсебеларуская нарада па рабоце сярод работніц. У часе падрыхтоўкі да нарады па прадпрыемствах і гарадах будуць праведзены канфэрэнцыі і зьлёты работніц па пытаньнях павышэньня кваліфікацыі і вылучэньня жанчын на адказную гаспадарчую і прафсаюзную работу.**

Паведамленьне

— 17 лістапада, у 12 гадзін дня, у памяшканьні Менгаркому КП(б)Б (заля пасяджэньняў, пакой 32) адбудзецца гарадзкая нарада рэдактароў пматтыражак. На нарадзе стаяць наступныя пытаньні: 1. Вуоны агляд пматтыражак заводаў: імя Варашылава, «Балшавік» і «Полымя рэвалюцыі» (Кастрычніцкага нумару); 2. Аб арганізацыі курсаў і ўкамплектаваньні ВКЖК. Яўка рэдактароў абавязкова і безагаворачна.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

СЁНЬНЯ і штодзенна АДКРЫТ
10-ы перасовачны
ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ
(Рог Рэспубліканскай і Інтэрнацыянальнай).
У складзе зьвярынцу нялікая калекцыя ўсялякіх дзікіх жывёл, зьвярэй, птушак і прасмыкаючыхся.
Зьвярынец адкрыт з 9 г. раніцы да 11 г. веч.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
1) Дуглас Фэрбэнкс у фільме СЫН ЗОРО
2) Кіно-хроніка СЛЮЗКІНО

Пралетары
Замежны фільм ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ
мастацкі фільм Сільныя і непераможныя

СПАРТАК
Каса з 4 г. дня.
Мастацкі фільм ЮДА
Драма ў 6 частках.

Беларуская фабрыка механізаванага лічэньня
пры кіраўніцтве народна-гаспадарчага ўліку БССР
абвяшчае НАБОР
на фабзавуч-брыгаду пры фабрыцы ў колькасьці 30 асоб для падрыхтоўкі апаратараў на вылічальных і шматма-аналітычных машынах і статыстычных работнікаў.
Тэрмін навучаньня 4 месяцы.
Прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодку і маюць падрыхтоўку ў аб'ёме 7 груп.
Вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй ў разьмеры 60 руб. у м есяц.
Жадаючыя паступіць падаюць заявы з дакумантамі аб сацыяльным паходжаньні, адукацыі, годзе нараджэньня,
не пазьней 25 лістапада.
Заняткі — з 1-га сьнежня.
Заявы падаваць асабіста ў дырэкцыю, рог Камуністычнай і Энгельса № 16.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ЧІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
СНАЙПЭР
(НЯМЫ ВАРЫЯНТ)
У галоўных ролях:
Афіцэр—Б. Шліхцінг,
Салдат—Л. Сабалоўскі.
Рэжысэр Ціташэнка.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО.
Каса адкрыта з 1 г. дня.

16-га лістапада г. г. у 6 гадзін вечара,
у памяшканьні клюбу Медсанпрацы (Рэвалюцыйная, 1)
АДКРЫВАЕЦЦА
ПЕРШЫ МЕНСКІ МІЖРАЁННЫ ЗЬЕЗД СКУРААБУТКОВАГА ПРАМСАЮЗУ.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Даклад агрбюро. 2. Кантрольныя лічбы на 1933 г. 3. Зацьвярджаньне каштарысу і процантныя адлічэньні. 4. Зацьвярджаньне статуту саюзу. 5. Выбары.
Усе делегаты павінны зьявіцца ў Менскупрамсаюз. (Ленінская, 2)
ДЛЯ РЭГІСТРАЦЫІ І АТРЫМАНЬНЯ МАНДАТАЎ.
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ—
16-га ЛІСТАПАДА ў 6 гадзін вечара, у клюбе Медсанпрацы.
АРГБЮРО.

Даводзіцца да ведама кліентуры,
што з 16 лістапада г.г. у Менску па Ленінскай, 14
адкрываецца
МЯСА-ГАРОДНІНЫ МАГАЗЫН
„ТОРГСІНУ".
Цэны на прадукты ўмераныя.
„ТОРГСІН".

16 лістапада г. г. у 12 гадз. дня, у Ін-це
ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА
Акадэміі Навук БССР (3-ці паверх, п. 39)
адбудзецца
даклад тав. Усса
АБ ТВОРЧАСЬЦІ РЭПІНА.
Запрашаюцца мастакі, удзельнікі самадзейных гурткоў па выяўленчым мастацтве і ўсе жадаючыя.
Дырэктарыят Ін-ту Л і М.

15 лістапада, у 12 гадзін дня ў Інстытуце
літаратуры і мастацтва
Акадэміі навук БССР (трэці паверх, пакой 39)
даклад асьпіранта тав. Пратасевіч
аб творчасьці Ш. ЧАРОТА.
Уваход вольны.
Дырэктарыят Ін-ту Л і М.

Чэрыкаўскі дзяржаўны вэтэрынарны тэхнікум
абвяшчае асеньні НАБОР на падрыхтоўчае аддзяленьне ў тэхнікум
у колькасьці 30 асоб.
На падрыхтоўчае аддзяленьне прымаюцца асобы, якія скончылі 7-годкі, а таксама, якія маюць веды ў аб'ёме 6 груп сямігодкі. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Заявы з дакумантамі аб сац. становішчы, адукацыі, годзе нараджэньня і стане здароўя прымаюцца да 25 лістапада.
Заняткі з 1 сьнежня 1932 г.
Заявы з 30 кап. маркамі накіраваць па адрасе: г. Чэрыкаў, вэттэхнікуму.
Дырэкцыя.

У адзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

Калектыў супрацоўнікаў Беларускага аддзяленьня АБШ выказвае свае спачуваньне кіраўніку аддзяленьня тав. АРЛОЎСКАМУ Ц. В. з прычыны раптоўнай сьмерці яго сына
ЭДУАРДА

Згодна пастановы прэзыдыуму Белкавпасаюзу
з 1 лістапада г. г.
РАЗДРОБНЫЯ АБ'ЯДНАНЬНІ:
галянтарэйна-трыкатажнае,
скурана-абутковае
і гатовага адзеньня
РЭАРГАНІЗУЮЦЦА
у Беларускае акцыянэрацыйнае аб'яднаньне раздробнага гандлю
„КААПГАНДАЛЬ"
Усе, што маюць прэтэнзіі да вышэйпамянёных аб'яднаньняў, павінны прад'явіць іх
не пазьней 1-га сьнежня г. г.,
пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.
Адрас аб'яднаньня: Савецкая, 43-13, пакой 34, тэл. 5-14.
Дырэкцыя.

БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ
„ТОРГСІН"
ПАТРЭБЕН ФІНАНСІСТ на пастаянную працу
З прапановамі зварачацца ў кантору (Камсамольская, 15). „ТОРГСІН".

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.